# НЕ ІСНАВАННЕ — ЖЫЦЦЁ!

**На Смаргоншчыне адкрыўся першы ў вобласці дом самастойнага сумеснага пражывання адзінокіх людзей**

**ГЭТУЮ падзею ў вёсцы Бялкоўшчына прымеркавалі да Дня работнікаў сацыяльнай абароны, а першымі навасельцамі разлічанага на дзесяць чалавек дома сталі васьмідзесяцігадовыя Яніна Целяжэвіч і Ірына Гецэвіч з іншых населеных пунктаў раёна — Клідзенятаў і Глінна. Яны сустрэлі гасцей пірагом, які самі спяклі разам з сацыяльным работнікам.**

— У нашым раёне пражывае адзінока каля шасці тысяч чалавек, а ў 724-х наогул няма блізкіх сваякоў, — расказвае **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Смаргонскага райвыканкама Святлана НОРЫК.** — Жыллёвыя ўмовы ў такіх людзей у асноўным далёка не лепшыя, ды і на сацыяльных работнікаў вялізная нагрузка, калі ў аддаленых хутарах засталося пяць-сем двароў. Як выходзіць з такога становішча, каб, з аднаго боку, стварыць годныя сацыяльныя ўмовы для пажылых людзей, а з другога — каб яны не адчувалі сябе пад нейкай апекай, а жылі ў звычным ім самастойным укладзе?

Спачатку на Смаргоншчыне думалі пайсці ўжо пракладзеным у многіх рэгіёнах Беларусі шляхам дамоў сезоннага пражывання, куды адзінокія людзі пераязджаюць, як правіла, на зімовы перыяд. Аддаюць 80 працэнтаў пенсіі — і дах над галавой, цяпло, харчаванне. Перачакаў халады — вярнуўся дахаты. Часовы, скажам так, прытулак.

А вось у Бялкоўшчыне будзе па-іншаму. У доме самастойнага сумеснага пражывання (побач з якім, дарэчы, размешчаны крама, пошта і ФАП) паселяцца, мяркуецца, не для таго, каб перачакаць непагадзь, а каб пастаянна жыць. У прыватнасці, першыя жыльцы Яніна Целяжэвіч і Ірына Гецэвіч адразу ж пацікавіліся ў Святланы Норык, ці можна будзе нешта вырошчваць побач з домам. А чаму б і не, калі ёсць жаданне і сілы? Зямлі хапае, плошча прысядзібнага ўчастка — 14 сотак. Ды і, мажліва, пашанцуе на грыбы, ягады — непадалёк лес.

Адрозненне ад дамоў сезоннага пражывання ў Бялкоўшчыне яшчэ і ў тым (гэта, бадай, галоўнае), што не прадугледжваецца ніякіх адлічэнняў з пенсій жыльцоў. Кожны сам распараджаецца сваёй пенсіяй (якую зарабіў — такую і маеш), аплачваючы толькі газ, ваду і электраэнергію.

Домам самастойнага сумеснага пражывання ў Бялкоўшчыне стаў былы будынак сельсавета, які капітальна адрамантаваны па ініцыятыве сацыяльнай службы, падтрыманай старшынёй Смаргонскага райвыканкама Мечыславам Гоем. Рамонт выканаў калектыў ААТ «Будындустрыя», прычым не абмежаваліся толькі выдатнай аддзелкай, дызайнам (шпалеры, кафля), але і паклапаціліся аб сучасным начынні дома. Не толькі ў жылых пакоях, але і на кухні, у ванным пакоі, прыбіральні.

Калі зробленае ўбачылі прадстаўнікі дабрачыннага фонду «Сафія», дык вырашылі таксама падставіць сваё «плячо» жыльцам гэтага дома — мэбляй, халадзільнікам і аўтаматычнай пральнай машынай.

Чакаецца, што неўзабаве кампанію Яніне Целяжэвіч і Ірыне Гецэвіч у доме самастойнага сумеснага пражывання ў вёсцы Бялкоўшчына складуць яшчэ двое пенсіянераў.

— У першых навасельцаў дома, — кажа Святлана Норык, — настрой цудоўны. У тых, хто прыклаў рукі і душу да ажыццяўлення гэтага праекта — таксама. Верыцца, што так будзе і надалей. І гэта датычыць не толькі дома ў Бялкоўшчыне, але і іншых падобных аб'ектаў. Не толькі на Смаргоншчыне, але і ў іншых рэгіёнах.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ЗНОЙДЗЕНЫ ЎНІКАЛЬНЫЯ ЗДЫМКІ ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

***— Фотаапаратамі якіх марак здымаў Валынцэвіч?***

— У яго мог быць «Цэйс-Ікан», «Кодак». Дарэчы, Людміла Сяргееўна пацвердзіла, што каля 1910 года дзед набыў другі апарат з «вузкім» кадрам — 8 на 14 (папярэдні быў 9 на 12). І з таго часу здымаў двума апаратамі, у залежнасці ад патрэбы.

***— Захапленне фота тады было раскошай?***

— З сялян, безумоўна, ніхто не мог сабе гэтага дазволіць. Мала таго, што сам апарат і негатывы каштавалі грошай, дык і для апрацоўкі фота трэба было мець цэлую лабараторыю! На некаторых здымках новай хаты Валынцэвіча мы, дарэчы, пабачылі ў кутку два маленькія акенцы. Мяркуем, што там і была яго лабараторыя. Ён не зарабляў на гэтым, рабіў выключна з-за вялікай любові да фатаграфіі і адчування прыгажосці, магіі кадра.

## «ЯМУ БЫЛО ЦІКАВА ЎСЁ: ПРАЧКІ НА РАЦЭ, УБОРКА ЎРАДЖАЮ, КРЫГАХОД НА ДЗВІНЕ...»

***— Самая першая фотка датуецца 1900 годам. Гэта значыць, што тады ён набыў апарат?***

— Так. На яго першым здымку — храм, дзе ён пачаў служыць, — Касута пад Вілейкай. Храм захаваўся. Дарэчы, захаваліся практычна ўсе храмы, дзе ён служыў ці да якіх меў дачыненне. Адзінае што, у Шэрашаве не захаваўся — не перажыў савецкі час...

***— Як вы адбіралі здымкі для выставы? Цяжка, пэўна было з 300 выбраць 130?***

— Кіраваліся ўласным густам, — кажа Зміцер Сярэбранікаў. — Глядзелі, каб было цікава, каб гэта выглядала нясумна. Вельмі шмат здымкаў яго сям'і — адбіралі самыя эфектныя, каб не стаміць наведвальніка. Мэта была — паказаць самыя разнастайныя фота: сям'я, царква, палац, уборка ўраджаю, нейкае свята... На гэтых здымках паказана Беларусь сто гадоў таму — і гэта надзвычай цікава!.. Вось здымак царкоўна-прыходскай школы. І па тым, як апрануты вучні, можна меркаваць, як жыла кожная сям'я.

***— Павел Валынцэвіч нідзе ж не вучыўся здымаць? Як вы ацэньваеце яго ўзровень?***

— Ён самавучка, — мяркуе спадар Суцягін. — Але кадраваць ён навучыўся выдатна — бо маляваў жа, таму адчуванне кампазіцыі меў добрае. Тое, што ў яго не было амбіцый — кшталту перамогі на выставе, — гэта цудоўна! Бо тады б здымкі не былі такія першародныя, такія нязмушаныя і натуральныя!..

***— Што патрапляла ў яго аб'ектыў?***

— Апроч сям'і — шмат чаго: уборка ўраджаю, прачкі на рацэ, крыгаход на Дзвіне, сонечнае зацьменне, разліў Дзвіны і затопленая вёска... За ракою ва Юстыніянаве жылі паны Грыбніцкія — ёсць здымкі з сумеснага адпачынку, як яны плывуць на карабельчыку, шпацыруюць па выспе. Дарэчы, дагэтуль лічылася, што здымкаў ці выразнай выявы маёнтка Юстыніянава няма (яго, між іншым, збудаваў выбітны італьянскі архітэктар Спампані). Малюнак Напалеона Орды дае нам няшмат інфармацыі таксама... Пра гэта нават піша польскі даследчык Афтаназі — вядомы спецыяліст у гэтай справе. А цяпер дзякуючы здымкам Валынцэвіча мы маем ажно дзве выявы палаца!.. Закладка царквы ў Дзісне — таксама, пагадзіцеся, надзвычай рэдкі кадр!..



**Зацьменне сонца ва Узьменах. 8 жніўня 1914 года.**



**Паны Грыбніцкія каля свайго палаца ў Юстыніянаве. Гэта — адзіны вядомы здымак маёнтка! 29 чэрвеня 1911 года.**

## «ЦАРКВУ ЗАЧЫНІЛІ ЗА ПАЎГОДА ДА СМЕРЦІ СВЯТАРА, А ВЯСКОЎЦЫ СПАЛІЛІ ЯГО ДЗЁННІКІ...»

***— Як змянілася жыццё святара пасля 1917 года?***

— Ён застаўся на тэрыторыі Польшчы — і да 1939 года яго не чапалі. Яго гэта ўратавала — бо літаральна побач, за кардонам, бальшавікі рэпрэсавалі і знішчылі ці выслалі практычна ўсіх святароў... Пасля 1939 года, калі Узьмены апынуліся ўжо на савецкай тэрыторыі, яго таксама моцна не чапалі. Я хачу звярнуць асаблівую ўвагу: Павел Валынцэвіч, напэўна, адзіны праваслаўны святар у Беларусі, чыё непарыўнае служэнне царкве склала 63 гады!..

***— Апроч надпісаў на фота, ці ёсць нейкія запісы, дзённікі, успаміны святара?***

— Добра, што хоць надпісы ёсць!.. Яны, дарэчы, зроблены на саміх негатывах. Прычым, рабіліся па эмульсіі як адлюстраванне — справа налева!.. Апроч лістоў святара да сваякоў, няма нічога. Толькі ёсць дакладныя ўспаміны, што ён дасканала, штодзённа запісваў усё, што з ім адбывалася. У 1948 годзе падчас пажару частка іх згарэла. Рэшту спалілі бальшавікі, калі зачынілі Свята-Мікалеўскую царкву ва Узьмене. Ва Узьмене і цяпер жывуць людзі, якія палілі гэтыя дзённікі. Яны ўсё нам расказалі. І цяпер вельмі шкадуюць, што рабілі гэта.

***— Калі зачынілі царкву, пасля смерці святара?***

— Зачынілі царкву трагічна і цынічна — у 1961 годзе. Святар памёр праз паўгода — у 1962-м... Якраз пайшла гэтая хрушчоўская хваля атэістычнага бандытызму...

***— У вёсцы цяпер памятаюць святара?***

— Так, вельмі добра! Больш за тое, у многіх хатах захоўваюцца яго здымкі. Вось, напрыклад, сфатаграфаваў ён шэсць чалавек з вёскі — кожнаму з іх надрукаваў здымак. Вельмі прыстойны чалавек быў! Мы ўжо, дарэчы, зрабілі экспазіцыю ва Узьменах — у царкве змясцілі некалькі здымкаў, а таксама ў школе, якая, уласна, і ёсць дом Паўла Валынцэвіча і знаходзіцца за 50 метраў ад царквы...

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара і Паўла ВАЛЫНЦЭВІЧА.**

# ДУМКІ ПРА СВАЮ «ВАЙНУ І МІР»

## І ІНШЫЯ КНІГІ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

Старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалаю Чаргінцу было што паведаміць аб працы сяброў яго арганізацыі. Выдадзена 50 кніг класікаў нашай літаратруры ў «Бібліятэцы Саюза пісьменнікаў». Заснавана новая серыя — надта актуальная для сённяшняга чытача — «Бібліятэка сучаснай беларускай прыгодніцкай і фантастычнай прозы» (22 кнігі выдадзены прыватным выдавецтвам «Харвест»). Асабліва добра карыстаюцца попытам у маладога пакалення кнігі пісьменнікаў—удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія яшчэ ў страі (іх парадавалі выданнем да гадавіны Перамогі). Дзейнасць нашых пісьменнікаў адзначана на высокім дзяржаўным узроўні. А яшчэ яны праводзяць шмат грамадскай працы: напрыклад, ездзяць у вайсковыя часткі, выступаюць перад дэсантнікамі і памежнікамі, каб падымаць маральны дух тых, хто са зброяй у руках штодня на варце інтарэсаў дзяржавы, пра што паведаміў старшыня Мінскага абласнога аддзялення Рыгор Сакалоўскі... Ёсць у нас пісьменнікі, якія дзеля стабільнасці жыцця гатовыя не толькі пісаць, але ў нейкім сэнсе мяняюць прафесію — умеюць сказаць палымяную прамову ці ідуць у грамадскія дзеячы. Таму што пісьменнік у нашай краіне — больш чым пісьменнік. Што ёсць, тое ёсць...

Вядома, жыццё сучаснага чалавека насычана рознымі клопатамі — няпроста пісьменніку знайсці час, каб напісаць твор вялікі і грандыёзны, які б адразу выклікаў эмоцыі кшталту: «Якая глыба, а?..» Але пытанне «Калі ж у нас з'явіцца свая «Вайна і мір?» пры ўсім разуменні сучаснай літаратурнай місіі падсвядомасць па-здрадніцку нагадвае простаму чытачу. Шчыра і адкрыта **Мікалай ЧАРГІНЕЦ** адказаў на гэтае пытанне:

— Што тычыцца сацыяльнага заказу... Тут хутчэй прэтэнзіі да Саюза пісьменнікаў Беларусі такога кшталту: мала ўдзяляюць увагі сённяшняму жыццю. Гэта правільна, мы разумеем. Але тут прасцей публіцысту, які адлюстроўвае менавіта сённяшні момант. А пісьменніку трэба нешта прадумаць, стварыць драму, каб цікава чыталася. Гэта працэс складаны. Мы падвяргаемся крытыцы — справядліва. Але штурхаць пісьменніка сілай, каб ішоў і напісаў кнігу, нельга. Не атрымаецца. Што тычыцца менавіта «Вайны і міру» — то там у рамане іншыя часы, больш рамантыкі. У нас час рамантыка сыходзіць, таму што на дапамогу людзям прыходзіць больш робатаў, тэхнікі. Умовы жыцця мяняюцца. Пісьменніку больш патрэбна цяпер знайсці тонкую нітку «чалавек і сучаснасць», паказаць з псіхалагічнага пункту погляду, што сёння адбываецца ў грамадстве. Гэта важна. Шмат хто разважае над гэтым. Прасцей стварыць дэтэктыў, прыдумаць інтрыгу. Пісаць пра сучасных людзей больш складана. Але працуюць нашы пісьменнікі і над гэтым.

Пісьменнік **Георгій МАРЧУК** дадаў:

— Калі гавораць: пакажыце ўзровень «Вайны і міру» і «Паднятай цаліны», то гэта было жаданне, каб паказалі ўзровень літаратуры, таленты. Кіраваць воляй і творчасцю мастака немагчыма. Калісьці Быкаў сказаў: «Мы ўжо напісалі сваю «Вайну і мір». Складзіце ўсё ад Вараб'ёва, Бондарава, Быкава, Мележа і ўсіх, хто пісаў пра вайну, — і будзе наша «Вайна і мір». Літаратура ж час ад часу мяняецца. Зараз ніхто не будзе чытаць 6 тамоў «Ціхага Дона». Кліпавая свядомасць прывучыла нас да іншага. Мы пішам коратка, прыходзіць новы час развіцця літаратуры. А вартасць літаратуры заўсёды вымяралася талентам. Паўтарыць тое, што дадзена, нельга. Напрыклад, за Мележам немагчыма паўтарыць твор такі, як «Людзі на балоце.» У нас свой час, свае людзі. І мы павінны запісаць нешта ў гэтым часе.

Па словах старшыні Саюза, творы нашых літаратараў атрымліваюць добрую адзнаку чытачоў. Аднак дрэнна ідзе прапаганда кніг, інфармацыя пра навінкі і аўтараў амаль не даходзіць да патэнцыйнага чытача. Таму цяпер сам Саюз будзе працаваць над тым, каб ствараліся анатацыі на кнігі, разам з фота і біяграфіяй аўтара, каб гэта трапляла ў бібліятэкі, каб у чытача ствараласяя цікавасць да выдання. За сімпатыі чытачоў пісьменнікам прыходзіцца змагацца. Нават з дапамогай папулярных заходаў. Напрыклад, у Беларусі можа стварыцца новая секцыя ці намінацыя — у песенным жанры. Усё дзеля таго, каб злучыць паэтаў з кампазітарамі і выканаўцамі. Таму што новыя песні краіне патрэбны. Як і новыя аўтары песень...

Збіраецца Саюз пісьменнікаў Беларусі выяўляць новыя імёны маладых літаратараў — праз літаратурныя конкурсы. У тым ліку і дзеля іх будучыні актыўна заводзяцца міжнародныя сувязі з калегамі.

— Мы актыўна працуем над стварэннем беларускага аддзялення Міжнароднага літфонду, — паведаміў Мікалай Чаргінец. — Гэта дапаможа больш клапаціцца пра нашых пісьменнікаў, атрымліваць нейкія сродкі на выданне кніг.

— Мы набіраем вышыню еўрапейскага ўзроўню, — дадае Георгій Марчук. — Да сяброўства ў нашым Саюзе далучыліся літаратары з Балгарыі, Польшчы, Літвы. Заключылі пагадненне аб творчым супрацоўніцтве з пісьменнікамі Таджыкістана, Казахстана і Турцыі. Напрыклад, ужо рыхтуецца да выдання ў перакладзе на турэцкую мову раман Мікалая Чаргінца «Сыны». Дагэтуль нікога з беларускіх пісьменнікаў у Турцыі не перакладалі. Стане магчыма ў нас чытаць літаратуру іншых краін, а ім — нашу, больш ведаць пра Беларусь.

Сапраўды, сучасная літаратура — творчае люстэрка краіны. Адносіны да творцаў у краіне — таксама люстэрка, у якім адбіваецца вобраз народа, які гэтых творцаў слухае, чытае, любіць, паважае. Магчыма, у нас, сённяшніх, свае ўяўленне і пра вайну, і пра мір, а таксама пра ролю пісьменніка ў грамадстве. А гэтую ролю вызначае не адно пакаленне чытачоў, таму што вялікія кнігі і пісьменнікі бачацца на адлегласці...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Абзац**

◢ У Беларусі на 1 студзеня бягучага года на аднаго беспрацоўнага ўмоўна прыпадала 1,5 вакансіі, паведамілі ў галоўным упраўленні палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Год таму на аднаго прэтэндэнта было менш як адно рабочае месца. У агульнай колькасці вакансій 77,2 працэнта прызначаны для рабочых. Амаль кожная трэцяя вакансія з агульнарэспубліканскага банка — у Мінску. У сталіцы свабодных рабочых месцаў у 4,9 раза больш, чым беспрацоўных.

**◢ Доля беларускіх фільмаў у вяртанні грошай у айчынным кінапракаце складае каля 4 %. Пра гэта заявіў на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе міністр культуры Павел Латушка, аргументуючы неабходнасць унясення змяненняў і дапаўненняў у закон аб кінематаграфіі.**

◢ У Мінску 12 студзеня ў двух ДТЗ на пешаходных пераходах былі збітыя людзі, а кіроўцы з месца здарэння зніклі. На перакрыжаванні вуліцы Голубева і праспекта газеты «Праўда» жанчына пераходзіла вуліцу на зялёнае святло, але аўтамабіль не прапусціў яе. Пацярпелая атрымала пералом калена. Хлапец атрымаў пералом пальца правай ступні пасля «сустрэчы» з машынай на перакрыжаванні вуліц Чайлыткі і Гарэцкага, хоць і ішоў на дазваляльны сігнал святлафора.

**◢ Сусветны эканамічны форум у Давосе прыняў рашэнне аб вызначэнні квоты для жанчын у дэлегацыях, якія прыбываюць на саміт. З бягучага года на кожных чатырох палітыкаў і бізнэсменаў-мужчын павінна прыходзіцца адна жанчына. Крытыкі гэтай квоты гавораць аб тым, што неабходна ўстанавіць суадносіны 3:1 ці нават 2:1.**

## Поўны абзац

◢ Прадстаўнік Партыі працы Ларэта Граўжынене на пасяджэнні парламецкага камітэта па бюджэце і фінансах Літвы прапанавала ў рамках барацьбы з ценявой эканомікай абкласці падаткамі прастытутак. Яна лічыць, што тыя буйныя грошы, якія круцяцца ў гэтым незаконным бізнэсе, не павінны мінаць бюджэт. А над тым, як гэта зрабіць, павінны падумаць адпаведныя ведамствы. Нельга таксама забывацца і пра тое, колькі дзяржаўных сродкаў ідзе на лячэнне прастытутак і іх кліентаў. Для падаткаабкладання «жрыц кахання», як лічыць міністр фінансаў Літвы Інгрыда Шыманітэ, неабавязкова легалізаваць прастытуцыю, бо нават нелегальныя даходы павінны абкладацца падаткам.

**◢ У адным з гарадоў Львоўскай вобласці дзвюм саракагадовым жанчынам, якія вярталіся дадому з гасцей, вельмі спадабаліся шары, якія ўпрыгожвалі галоўную гарадскую ёлку. Яны не змаглі ўтрымацца ад спакусы залезці на дрэва і прыхапіць некалькі цацак з сабой. Але міліцыянеры не далі здзейсніць задуманае. Яны дапамаглі дамам спусціцца з дрэва і склалі акт аб адміністрацыйным правапарушэнні. Сяброўкам давядзецца заплаціць па 180 грывен штрафу.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# ПАЛЯВАННЕ НА СТОМЛЕНАГА «ЗУБРА»

**Бываюць такія моманты, калі сілы проста пакідаюць нават самых лепшых, самых вынослівых спартсменаў. Гульцы могуць старацца, злавацца, выступаць «на жылах», але нічога ўжо не атрымліваецца. Амаль на роўных два перыяды змагаючыся супраць аднаго з лідараў Заходняй канферэнцыі КХЛ, піцерскім СКА, мінскае «Дынама» вымушана было саступіць, праваліўшы трэцюю дваццаціхвілінку.**

Хуткасць хакейнай гульні камандаў працягвала радаваць прыхільнікаў абодвух клубаў. Трошкі небяспечней атрымлівалася, безумоўна, у СКА, аднак і «зубры» раз-пораз адказвалі вострымі атакамі. Найбольш актыўнымі ў складзе мінчан былі Плат і Корса. Звязка канадцаў хутка прызвычаілася да дзеянняў адзін аднаго і дэманструе сапраўды эфектную, а галоўнае — эфектыўную гульню. Менавіта Джэф Плат у сярэдзіне другога перыяду зрабіў лік на табло нічыйным — 1:1. Атрымаўшы пас ад Міхалёва, канадзец выкаціўся сам-насам з Сакаловым і магутным кідком ледзь не парваў сетку за варотамі галкіпера. Пасля Плат у стылі Аляксандра Авечкіна кінуўся на загараджальнае шкло, святкуючы шайбу разам з гледачамі.

А вось адкрыты лік быў у сярэдзіне першага перыяду. Атака «Дынама» скончылася згубленай шайбай і, як падалося большасці з тых, хто бачыў эпізод, парушэннем супраць беларускага нападаючага. Аднак суддзя не прыпыніў гульню, піцерцы не сталі чакаць, а дынамаўскі абаронца Томаш Мойжыш ніяк не перашкодзіў Петру Чаянэку закінуць у пусты куток варотаў Эша.

Другі перыяд праходзіў з невялікай перавагай гасцей. Яны пагражалі варотам Эша з розных пазіцый, але амерыканскі галкіпер быў бездакорны. І толькі за адну секунду (!) да другога перапынку Максім Афінагенаў закінуў другую шайбу ў вароты «Дынама». Гэты момант, відаць, псіхалагічна пашкодзіў гаспадарам. Тым больш што і фізічных сіл заставалася мала — гэта быў пяты паядынак мінчан за 8 дзён. Пры гэтым «Дынама» і так лідар лігі па колькасці праведзеных матчаў. І куды толькі глядзелі складальнікі календара..

СКА закінуў у трэцім перыядзе яшчэ дзве шайбы, вызначыліся Чаянэк і Вішнеўскі. А гаспадары проста дакатвалі да фінальнай сірэны, каб хутчэй адпачыць і рыхтавацца да наступных матчаў, яшчэ двух за тры дні. І ўжо ў Бабруйску, бо «Мінск-Арэна» прымае фінал Кантынентальнага кубка з удзелам «Юнацтва».

**Яўген ВАРАКСА.**


## УП «Надежные Программы» ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ НА РЕАЛИЗАЦИЮ УСЛУГ ПО РАЗМЕЩЕНИЮ РЕКЛАМЫ НА ПОРТАЛАХ

**www.tut.by, www.rebenok.by, www.velvet.by**

**в период с 14 февраля по 30 июня 2011 года.**

Организатором аукционов является УП «Надежные Программы», УНП 100160363, г. Минск, ул. В. Хоружей, 1а, 6 этаж, комната 2, телефон (017) 239 57 77, расчетный счет 3012004700008 в ЗАО «БелСвиссБанк», г. Минск, код 175.

С графиком проведения аукционов, порядком их проведения, формой заявки на участие в аукционе, а также начальной ценой предмета аукциона можно будет ознакомиться более подробно на сайте http://tutby.com/ в разделе Аукционы после 14 февраля 2011 года.

Для участия в аукционе участникам необходимо направить в адрес организатора заявление на участие в аукционе и перечислить на расчетный счет организатора задаток в размере одной тысячи белорусских рублей.

## ООО «Веб Эксперт» ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ НА РЕАЛИЗАЦИЮ УСЛУГ ПО РАЗМЕЩЕНИЮ РЕКЛАМЫ НА ПОРТАЛАХ

**www.tut.by, www.mail.ru, www.rbc.ru, www.zaycev.by, www.itv.by, www.kosht.com, www.wday.ru, www.elle.ru, www.Maximonline.ru, www.deal.by, www.vteme.by**

**в период с 14 февраля по 30 июня 2011 года.**

Организатором аукционов является ООО «Веб Эксперт», УНП 191089974, г. Минск, пр-т Независимости, 95, офис 509, телефон (017) 287 37 58, расчетный счет 3012017153004 в РКЦ № 1 ЗАО «БелСвиссБанк», пр-т Победителей, 23/3, код 175, г. Минск.

С графиком проведения аукционов, порядком их проведения, формой заявки на участие в аукционе, а также начальной ценой предмета аукциона можно будет ознакомиться более подробно на сайте http://webexpert.by/ в разделе Аукционы после 14 февраля 2011 года.

Для участия в аукционе участникам необходимо направить в адрес организатора заявление на участие в аукционе и перечислить на расчетный счет организатора задаток в размере одна тысяча белорусских рублей.


## Администрация Фрунзенского района г. Минска УТОЧНЯЕТ

Место проведения встречи рабочей группы с жителями района по поводу общественного обсуждения проекта «Многоквартирный жилой дом в квартале ул. Бурдейного—Тимошенко—Одинцова—Якубовского».

**Встреча рабочей группы с населением состоится 25.01.11 г. в помещении СШ № 151 ул. Одинцова, д. 12 (начало в 19.00).**

Представитель организатора — отдел архитектуры и градостроительства администрации Фрунзенского района г. Минска, ул. Кальварийская, 39, **т. 204 41 73.** УНП 191239047

## Уважаемые акционеры ОАО «Универсам «Северный»!

**24.01.2011 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Универсам «Северный».**

**Повестка дня:**

1. О перевыборах членов совета директоров.
2. О совершении сделок Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3. Начало регистрации участников собрания — 10.30. УНП 100356386

## Открытое акционерное общество «Управление механизации № 79»

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 26 ЯНВАРЯ 2011 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ.**

**Повестка дня:**

***1. Об оказании Обществом безвозмездной (спонсорской) помощи.***

Место проведения собрания: ***г. Минск, ул. Селицкого, 27/2, 3-й этаж, кабинет отдела техники безопасности.***

Время начала проведения собрания — ***10.00.***

Время регистрации участников собрания — ***в день проведения собрания с 9.00 до 9.30 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — и доверенности.***

Время и место ознакомления акционерами с материалами по вопросам повестки дня собрания — в рабочие дни, начиная с 14 января 2011 г. по месту нахождения Общества с 13.00 до 17.00, в день проведения собрания — по месту проведения собрания до 9.00.

УНП 100090613

***Наблюдательный совет.***

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже земельных участков в частную собственность для индивидуального жилищного строительства в д. Оконо, д. Селище, д. Воронь

**Организатор: Стайский сельский исполнительный комитет**

| Лот | Месторасположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение земельного участка | Условия и ограничения, инженерно-геологические условия | Расходы по подготовке и изготовлению документации | Начальная цена, рублей | Сумма залога, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Оконо, площадь 0,2499 га, кадастровый номер 222783605501000115 | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (река Оконица) | 1021288 | 2000000 | 200000 |
| 2 | д. Воронь, площадь 0,1658 га, кадастровый номер 222783601001000082 | то же | Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Воронь). Охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В | 1045716 | 3000000 | 300000 |
| 3 | д. Селище, У-2, площадь 0,1953 га, кадастровый номер 222783607101000054 | то же | Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Оконо) | 2211971 | 6000000 | 600000 |
| 4 | д. Селище, У-3, площадь 0,1953 га, кадастровый номер 222783607101000053 | то же | Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Оконо) | 1701463 | 6000000 | 600000 |
| 5 | д. Селище, У-4, площадь 0,1953 га, кадастровый номер 222783607101000055 | то же | Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Оконо) | 1701463 | 6000000 | 600000 |
| 6 | д. Селище, У-5, площадь 0,2035 га, кадастровый номер 222783607101000052 | то же | Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Оконо) | 1754314 | 6000000 | 600000 |

** Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ.*

**1. Аукцион состоится 15 февраля 2011 года в 14.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, д. Стаи, ул. Лепельская, д. 12.**

2. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, д. Стаи, ул. Лепельская, д. 12. **Последний день приема заявлений 11 февраля 2011 года.**

3. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителю гражданина — нотариально удостоверенную доверенность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность и копии платежных документов, подтверждающих уплату залога на расчетный счет 3641319101034 в ЦБУ № 211 филиала № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Лепель, ул. Гагарина, 1, МФО 660, УНП 300039704.

Получатель — Стайский сельский исполнительный комитет.

4. Не допускается начало торгов по начальной цене.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, расходов по подготовке и изготовлению документации, расходов на публикацию в средствах массовой информации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении (передаче в частную собственность) победителю аукциона земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

**Контактные телефоны: 8(02132) — 2 49 42; 2 40 60; 8(029) — 1333108.**

## ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**17 февраля 2011 г. проводит открытый аукцион с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Площадь, га | Целевое назначение | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, инженерно-технических условий | Объекты недвижимости, подлежащие сносу | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом, расположенных на них объектов, возмещаемых победителем аукциона землепользователям, бел. руб. | Срок аренды (лет) | Затраты на подготовку документации, бел. руб. | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Войсковая (бывшая территория воинской части) | 0,5175 | Строительство зданий административно-хозяйственного и производственного назначения. См. условия аукциона. | К землям сельскохозяйственного назначения не относятся | Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. | Здание | 56 610 000 | 50 | 3 215 105 | 212 144 232 | 21 214 000 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объект выставляется на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту в натуре, с проектом договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

3. **Аукцион состоится 17 февраля 2011 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518, управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляются:

4.1 юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

4.2 иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

4.3 представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

4.4 при подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

5. Победитель обязан:

5.1 кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона в белорусских рублях или иностранной валюте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа;

5.2. победитель аукциона обязан подписать договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в течение 15 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона.

6. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 11 февраля 2011 г. включительно** в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21, каб. № 4. Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**ПРИМЕЧАНИЕ. Условия аукциона: размещение объекта коммунального хозяйства либо объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автозаправочных и газонаполнительных станций).**

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www.gorod.gomel.by**

## СЕРАДА, 19 СТУДЗЕНЯ

### ПЕРШЫ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.45 Навіны.
6.05, 1.00 Дзень спорту.
6.10, 7.10, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.05, 8.10, 18.50, 0.55 Зона Х.
7.30, 11.55 Дзелавое жыццё.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.10 Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Богаяўлення (Хрышчэння Гасподняга).
9.20, 20.00 Серыял «Маргоша».
10.15, 17.05 Серыял «Маршрут міласэрнасці».
11.05, 17.50 Серыял «Маруся».
12.10 Меладрама «Кука».
14.05 «Модныя бачанні бельгійскіх замкаў».
14.30 Альманах падарожжаў.
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.40 «OFF STAGE LIFE».
16.05 «Акно ў Еўропу».
16.30 «Эпоха». «Радзівілы».
19.25 «Спортлато 5 з 36».
19.30 «КЕНО».
19.35 Зямельнае пытанне.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «Падмані мяне».
22.55 Меладрама «Прадказанне».

### АНТ

6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Мая жонка мяне прываражыла». Серыял.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20 Навіны спорту.
11.10 «Марскі патруль». Серыял. Заключная серыя.
12.20 «Дэтэктывы».
13.10 «Кантрольная закупка».
13.45 «Модны прыгавор».
14.50 «Зразумець. Даравацъ».
15.25 «Хачу ведаць».
16.15 «Заручальны пярсцёнак». Серыял.
17.05 «Слова жанчыне». Серыял.
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.
18.55 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 «Доктар Тырса». Серыял.
22.05 «Капітан Гардзееў». Серыял.
23.25 Асяроддзе пражывання. «Варажба на кававай гушчы».
0.25 «Віёла Тараканава. У свеце злачынных страсцяў». Серыял.
1.15 Начныя навіны.

### ЛАД

6.35, 22.45 Серыял «Універ».
7.00 ЛАДная раніца.
8.00, 21.05 Тэлебарометр.
8.05, 22.10 Серыял «Інтэрны».
8.35, 16.55 Серыял «Чыста англійскія забойствы».
9.35, 18.00 Серыял «Ты маё жыццё».
10.35 Фільм-катастрофа «Экіпаж».
11.45 Спорт-кадр.
12.10 «Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
13.00 Урачэбныя тайны.
13.35 Серыял «Сіла прыцяжэння».
14.25 «Халі-галі». Скетч-шоу.
14.45 Дача здароўя.
15.20 М/с «Сямейка піратаў».
15.45 Пазакласная гадзіна.
16.05, 23.50 Серыял «Налётчыкі».
19.05 Камедыя «Дзяўчаты».
20.50 «Калыханка».
21.10 Беларуская часінка.
23.20 Рэальны свет.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «МінШчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10 «СТБ-спорт».
8.30, 20.25 «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
9.30 «Аўтапанарама».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 «Багатая і каханая». Серыял.
11.30 «Далёкія сваякі».
11.40, 17.30 «Званая вячэра».
12.35, 18.30 Серыял «Дарослыя гульні».
13.50 «Дурні, дарогі, грошы». Серыял.
14.40 «Студэнты International». Серыял.
15.30, 22.55 «Выкраданне багіні». Серыял.
16.50 «Новыя падарожжы дылетанта».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
21.30 «Мінск і мінчане».
22.05 «Скардзіцца дазволена».
23.45 «Інструктар». Серыял.

### МІР

*Прафілактыка*
11.05, 12.05, 3.30 Маст. фільм «Рынг».
12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
13.05 М/с «Мільён гадоў да нашай эры».
13.30 Серыял «Старшакласнікі».
14.05 Серыял «Люба, дзеці і завод».
14.30 «Рэальныя гісторыі».
15.20 «Гісторыя стварэння».
16.05, 23.05 Серыял «Вылечванне каханнем».
17.05, 0.05 Ток-шоу «Слова за слова».
18.20 «Акцэнты».
18.30, 2.00 «Сардэчна запрашаем».
19.00 Серыял «Прынцэса цырка».
19.50, 1.05 Серыял «Вогнезмагары».
20.45 «XX стагоддзе: найвялікшыя моманты гісторыі».
21.20 «Сакрэтныя матэрыялы».
22.05 «Жывая гісторыя: Р. Нікалсан».
2.30 Серыял «Ваўчыха».

### 8 КАНАЛ

7.00, 10.55, 12.40, 14.35, 18.35, 19.40, 21.00, 23.20 «Надвор'е».
7.05, 17.30 Серыял «Прытворшчык».
8.15 «Аповеды пра жывёл».
8.40, 12.20, 23.00 «Кінаблакнот».
9.00 «Адшукваецца адпачынак».
9.30, 15.40 Мультпарад.
10.00, 19.45 Серыял «Гарац».
11.00 Дэтэктыў «Памылка рэзідэнта».
12.45 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».
14.40, 18.40 Серыял «Ракіроўка».
16.00 Дак. фільм «Вада».
20.45 «Вечарніца».
20.55 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.05 Баявік «Місія невыканальная».

### ВТБ

6.00, 23.30 «PLAY».
8.00, 18.00, 23.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 13.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00, 15.00, 19.00 Серыял «Ранеткі».
11.00, 14.00 Серыял «Цуды. com».
12.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
16.00 Камедыя «Здзелка».
21.00 Камедыя «Мільярды Бэйлі».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
9.20, 18.50 Серыял «Еўфрасіння».
10.10 «Сто гадоў неадзіноцтва. Ігар Маісееў». Дак. фільм.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 17.20 «Кулагін і партнёры».
12.00, 20.30 Серыял «У лясах і на гарах».
13.50, 16.50, 19.50, 23.20 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.25 «Сапраўднае жыццё».
16.15 Серыял «Дворык».
17.50 Серыял «Чорная багіня».
22.20 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
23.30 «Весткі.ru».
23.45 «Разбітыя мары актрысы Нікішчыхінай». Дак. фільм.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

*Прафілактыка*
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15 Сёння.
10.20 «Дачны адказ».
11.20 «Збегчы з ГУЛАГА».
12.05 «Да суда».
13.30 Серыял «Ментоўскія войны».
15.10 «Справа густу».
15.35, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Эра стральца».
19.35 Серыял «Павуцінне».
21.30 Серыял «Зверабой».
23.35 Серыял «Шпіёнскія гульні».

### ТНТ

*1.00—11.00 Прафілактыка на ТНТ.*
11.00 М/с «Тасманскі д'ябал».
11.40 «Нікеладэон на ТНТ».
12.30 М/с «Бэтмен: адважны і смелы».
13.00 «Жаночая ліга».
13.30, 22.00, 3.40 «Дом-2».
15.10 «Уладар ежы». Камедыя.
17.00, 19.00 «Універ». Сітком.
17.30, 19.30 Серыял «Рэальныя хлопцы».
18.00 «Жаночая ліга: хлопцы, грошы і каханне».
18.30 Серыял «Шчаслівыя разам».
20.00 Меладрама «Дзённікі нянькі».
23.30 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
0.00 «Камедзі Клаб».
1.00 «Сябры». Серыял.
1.50 «Спіс». Трылер.
4.40 «Камедыянты».

### ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10 Раніца з Інтэрам.
9.10, 5.05 Адзін у полі.
9.55, 16.45, 0.50 Серыял «Простыя ісціны».
10.50, 16.15, 1.45 Серыял «Свая каманда».
11.15, 20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.15 Знак якасці.
12.50 Маст. фільм «Буран».
14.25, 22.05 Маст. фільм «Сем гадзін да гібелі».
15.35, 23.45 Судовыя справы.
17.40, 2.15 Серыял «Танга ўтраіх».
18.25, 3.30 Серыял «Агонь кахання».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
21.20, 5.50 Серыял «Невідзімкі».
23.15 Праўда жыцця.
0.30, 6.40 Феерыя падарожжаў.

### КУЛЬТУРА

9.00, 14.30, 18.30, 22.30 Навіны культуры.
9.15, 18.45 Галоўная роля.
9.30, 0.50 Праграма перадач.
9.40, 22.50 «Вясна Мікеланджэла». Маст. фільм.
11.15 «Лета Гасподняе». «Святое Богаяўленне. Хрышчэнне Гасподняе».
11.45, 16.30, 1.40 «Сусветныя скарбы культуры».
12.00 «Уся праўда пра Ганібала». Дак. фільм.
12.50 Легенды Царскага Сяла.
13.20 «Адкрытая кніга». Маст. фільм.
14.40 «Зверапорт». М/с.
14.50 «Чуфык». «Прыходзь на каток». М/ф.
15.10 «Чарадзейнае дрэва». Серыял.
15.40 «Маёнтак сурыкатаў». Дак. серыял.
16.05, 22.00 «Пакажам люстэрка прыродзе...»
16.45 Расійскія зоркі сусветнай оперы. Дзмітрый Корчак.
17.35 «Васко да Гама». Дак. фільм.
17.40, 0.55 «Шукальнікі». «Савецкі Галівуд».
19.05 «Абсалютны слых».
19.45 65 гадоў з дня нараджэння музыканта. «Яўген Колабаў». Дак. фільм.
20.25 Загадкі гісторыі. «Калі рымляне правілі Егіптам». Дак. фільм.
21.15 Магія кіно.
0.25 «І азірнуўся я на справы мае...» Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «... Да 16 і старэйшым». 1992 г.
5.45 «Шафёрская балада». Дак. фільм. 1986 г.
6.40 «Наташа». Маст. фільм. 1989 г.
8.00, 14.00, 20.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 21.00 «Народжаныя ў СССР».
10.10 «Спяваюць Ігар Нікалаеў і Наташа Каралёва». 1994 г.
11.00 «Мы — клоўны».
11.30 «Камера глядзіць у свет». 1986 г.
12.20 «Канцэрт савецкай песні». 1983 г.
12.40, 18.40 Дэтэктыў «Калье Шарлоты».
16.10 «Вакол смеху». 1980 г.
17.00 «Успаміны пра Арно Бабаджаняна».
18.10 Фільм пра палітычную адказнасць КПСС перад народам. 1991 г.
22.00 «Мікалай Трафімаў». Дак. фільм.
23.00 «Акулы пяра». «Агата Крысці».
0.00 «Што? Дзе? Калі?». 1983 г.
1.20 «Пакуль усе дома».
2.00 «Быў час».
3.00 «Тэатральныя сустрэчы». 1980 г.

### MTV

5.00, 0.50 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
7.35, 23.05 Тайныя спакусы курортнага гатэля.
7.50, 22.40 Наступны.
8.30, 23.30 Шалёныя продкі.
8.55, 23.55 Магія Крыса Энджэла.
9.20 Праўда жыцця: Я жыву ў інтэрнэце...
10.10 Цяжарная ў 16.
11.00 Немагчымае магчыма.
11.50 Хто круцейшы.
12.15, 18.50 News блок.
12.25, 17.30 «Подыум».
13.45, 21.25 «Два з паловай чалавекі». Серыял.
14.10, 20.55 «Усё лепшае ў табе». Серыял.
14.35, 19.00 «Ранеткі». Серыял.
15.35, 20.00 «На службе ў д'ябла». Серыял.
16.30 Бісся і спявай.
21.50 «Клініка». Серыял.
22.15 «Клава, давай!». Серыял.
0.20 Ікона відэагульняў.

### НАША КІНО

6.30, 12.30 Меладрама «Дзённы цягнік».
8.30, 14.30 Драма «Фантазіі Фарацьева».
10.55, 16.55 Меладрама «Кахаю. Чакаю. Лена».
18.30, 0.30 Кінааповесць «Мой сябар Іван Лапшын».
20.30, 2.30 Маст. фільм «Канец імператара тайгі».
22.30, 4.30 Дэтэктыў «Мытня».

### ДОМ КІНО

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Падары мне жыццё».
3.50 Маст. фільм «Космас як прадчуванне».
5.20 Камедыя «Неверагодныя прыгоды італьянцаў у Расіі».
7.00 Меладрама «Ванечка».
8.45 Камедыя «Пакроўскія вароты».
11.50 Меладрама «Зіна-Зінуля».
13.15 Камедыя «Бабнік-2».
14.25 Меладрама «Кветкі ад пераможцаў».
16.05 Меладрама «Вялікая навагодняя ноч».
17.10 Камедыя «Лузар».
19.50 Трагікамедыя «Вяселле».
21.40 Маст. фільм «Радня».
23.15 Меладрама «Эдгар і Крысціна».
0.40 Маст. фільм «Бераг».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Маст. фільм «Плыві, караблік...».
6.10, 10.10, 14.10 М/с «Па слядах Бамбра». М/ф: «Які гук выдае камар?», «Падарунак для самага слабага», «Ветрык».
7.00, 11.00 Казка «Садко багаты». М/ф: «Ахвотнік да казак», «Прыгоды Коскі і Кропкі», «Поры года».
8.00, 12.00 Казка «Жураўліныя пёры». М/ф: «Люстэрачка», «Вясёлая карусель» № 19 «Апошняе паляванне», «Як гэта здарылася».
15.00 Маст. фільм «Каштанка».
16.05 М/с «Пастка для Бамбра». М/ф: «У лясным гушчары», «Краіна Аркестрыя».
17.00 Казка «Блазан Балакіраў». М/ф: «Волатаўская каша», «Пазалочаныя ілбы», «Улюблівая варона».
18.00 Казка «Чурыдзіла». М/ф: «Рыжая котка», «Хлопчык як хлопчык», «Воўк і цяля».

### ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Іваноў і Рабіновіч».
20.00, 2.00 Серыял «Мент у законе».
21.00, 3.00 Серыял «Ментоўскія войны-5».
22.00 Драма «Чалавек са звалкі».
23.30 Серыял «Яры». 1-я серыя.

### ТБ3

5.00 М/ф «Бэтмен будучыні».
5.30, 1.00 Серыял «Альф».
6.00, 1.30 Дак. фільм «Трэцяя планета ад сонца».
6.30, 15.30 «Як гэта зроблена».
7.00, 14.30 Разбуральнікі міфаў.
8.00, 2.00 Дак. фільм «Сучасныя цуды».
9.00, 18.00 Серыял «Медыум».
10.00, 19.00 Серыял «Вітая лесвіца».
11.00, 20.00 Дак. фільм «Апакаліпсіс».
12.00 Дак. фільм «Гарадскія легенды».
12.30 Маст. фільм «Лютасць Грызлі».
16.00, 0.00 Серыял «Чорная метка».
17.00 Дак. фільм «Мільён у малочным бітоне».
21.00 Маст. фільм «Зло, якое выжыла».
23.00 Серыял «Вавілон-5».
3.00 Серыял «Анёл».
4.00 Серыял «Зена — каралева воінаў».

### ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Трылер «Нас не дагоніш».
10.40, 18.40, 2.40 Драма «Домбі і сын».
12.30, 20.30, 4.30 Серыял «Спецыяльнае падраздзяленне».
13.25, 21.25, 5.25 Драма «Сямейная тайна».
15.15, 23.15, 7.15 Трылер «Саўдзел».

### 22.55 ФІЛЬМ ДНЯ

**«ПРАДКАЗАННЕ»** (РАСІЯ—ФРАНЦЫЯ, 1993 г.)

Масква, пачатак 1990-х. Вядомаму пісьменніку Алегу Гарунову, немаладому і адзінокаму чалавеку, калі верыць варажбе прывакзальнай цыганкі, застаецца жыць усяго 24 гадзіны. Гэтыя апошнія суткі становяцца для яго больш насычанымі, чым усё яго жыццё.

**Рэжысёр** — Эльдар Разанаў. **У ролях:** Алег Басілашвілі, Ірэн Жакоб, Андрэй Сакалоў.



### ТБ1000

3.00, 21.00 Драма «Тайны «Начнога дазору».
5.20 Драма «Маці і дзіця».
7.30 Камедыя «Сямейная справа».
9.10 Драма «Аўгуст Раш».
11.10 Камедыя «Шэсць жонак Генры Лефэя».
13.00 Камедыя «Звярынец».
15.00 Камедыя «Каманда».
17.10 Камедыя «Каханне і іншыя катастрофы».
19.00 Драма «Аўгуст».
23.30 Драма «Пастскрыптум».
1.10 Драма «Трымай дыстанцыю».

### DIVA UNIVERSAL

5.00, 3.20 Серыял «Вайна Фойла».
6.35, 12.30, 18.20 Серыял «Дамы сям'і Гілмор».
7.20 Маст. фільм «Выкраданне».
8.50, 21.40 Маст. фільм «Ганна Карэніна».
10.50 Серыял «Джордан расследуе».
11.40, 19.10 Серыял «Добрая жонка».
13.20 Маст. фільм «Новаспечаны бацька».
15.00 Маст. фільм «Злачынствы моды: забойная стрыжка».
16.40 «Таямнічыя Каляды: загадка вострава ценяў».
20.00 Серыял «Шпік».
23.40 Драма «Тайны нераскрытых злачынстваў».
0.30 Камедыя «Перш чым скажаш «так».
2.00 Трылер «Выкрадзеная цнатлівасць».

### РАМАНТЫКА

7.00, 16.55, 21.20, 5.20 «Тайна Лауры».
7.55, 10.40, 20.30 «Анучная лялька».
8.50, 14.10, 0.55 «Ніколі не позна?».
9.45, 15.05, 3.35 «Сямейныя вузы».
11.30, 17.45, 2.40 «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
12.25, 1.50, 6.10 «Жанчыны на сцежцы вайны».
13.20, 23.05, 4.30 «Дора на варце парадку».
16.00, 19.35, 22.10 «Дасканалая прыгажосць».
0.00 «Інтымнае жыццё звычайных людзей».

### AXN-SciFi

0.35, 6.35, 19.15 Мёртвая зона.
1.20, 18.30 4400.
2.05, 4.35, 13.45, 23.30 Bleach.
2.25, 9.15 Зена.
3.10, 5.45, 13.00 Зорны крэйсер Галактыка.
3.55, 10.00, 23.50 Медыум.
5.00, 12.15, 17.45 Зорныя Вароты.
7.15, 14.15, 21.30 Звышнатуральнае.
8.00, 15.00, 22.15 Чорная лагуна.
10.45, 16.15 Дзённікі вампіра.
20.00 Кайл XY.

### EUROSPORT

4.00, 23.50, 2.00 Тэніс. Australian Open.
15.00, 17.00, 20.45 Ралі. Серыя IRC.
16.15 Футбол. Еўрагалы.
16.45 Вось гэта дзіва!!!
18.15 Футбол. Кубак Азіі ў Катары.
20.15, 1.30 «Гейм, сэт і матч».
20.45 Ралі. Серыя IRC.
21.20 Выбранае па серадах.
21.25 Навіны коннага спорту.
21.30 Гольф. Тур PGA.
22.30 Гольф. Еўратур.
23.00 Гольф-клуб.
23.05 Парусны спорт.
23.35 Яхт-клуб.
23.40 «Спартыўнае падарожжа».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 18.00 Суперзбудаванні.
6.00, 14.00 Вялікія міграцыі.
7.00, 12.00 Мегазлом.
8.00, 13.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
9.00, 15.00 Небяспечныя сустрэчы.
10.00, 16.00, 4.00 Амерыканскія гонкі.
11.00, 19.00 Мегаполісы.
11.30, 19.30 «Вясёлая навука».
17.00 Расследаванні авіякатастроф.
20.00, 23.00, 2.00 «Падарожжа па планетах».
21.00, 0.00, 3.00 Вампіры ў Венецыі.
22.00 Суперзбудаванні старажытнасці.
1.00 Тайны гісторыі.
1.30 Секунды да катастрофы.

### DISCOVERY

7.00 «Хлам? Не, машына!».
7.25, 15.15 Брудная работка.
8.20, 19.00, 5.10 Як гэта ўстроена?
8.50, 19.30, 5.40 «З чаго гэта зроблена?».
9.15, 18.00, 3.50 Разбуральнікі легендаў.
10.10, 2.55, 6.05 Лабараторыя выбуховых ідэй.
11.05, 21.00, 2.00 Выжыць любой цаной.
12.00, 17.05 Зброя будучыні.
12.55, 20.00, 1.00 «Top Gear».
13.50 Круты цюнінг.
14.45 «Пятая перадача».
16.10, 0.00 «Бяспека межаў».
22.00 Мужчына, жанчына, прырода.
23.00 Амерыканскія лесарубы.
4.45 «Маланкавыя катастрофы».

### TRAVEL

5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 20.00, 1.00 Сусветны падарожнік.
6.00, 12.30 Раскошныя падарожжы з Варунам Шармай.
7.00 Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
8.00, 15.30 Сафі Грыгсан на ўсходнім базары.
8.30 Галівуд і вінаград.
9.00 Круіз у пошуках прыгод.
11.00 Планета ежы.
12.00 Падарожжа са смакам.
13.30 Пра галоўнае.
15.00 Паглядзець за 48 гадзін.
16.00 Кулінарная Азія.
18.00, 23.00 Каліфорнія сёння.
18.30, 23.30 Насустрач мастацтву.
19.00, 0.00 Цудоўныя падарожжы вачыма відавочцы з Варунам Шармай.
22.00, 3.00 Блакітны кантынент.
4.00 Лепшыя прагулкі па чыгунцы.
4.30 Вялікая рыба.

### ANIMAL PLANET

7.00 Маёнтак сурыкатаў.
7.25 Планета дзікіх.
7.50 Планета малых.
8.40 Усё пра сабак.
9.10, 6.10 «Разбуральнікі стэрэатыпаў».
10.05 Саба і сакрэт насарога.
11.00 «Тэрыторыя жывёл».
11.55 «SOS дзікай прыроды».
12.50 Паліцыя Х'юстана: аддзел па абароне жывёл.
13.45 «Таварыства па выратаванні жывёл».
14.10 Ветэрынары-стажоры.
14.40 Выратаванне відаў.
15.30, 20.10 Перакладчык з сабачай.
16.30 «Прыгоды панды».
17.25 «Самыя нясцерпныя ручныя жывёлы Брытаніі».
18.20 Незвычайныя жывёлы Ніка Бэйкера.
19.15, 1.40 Уводзіны ў сабаказнаўства.
21.05, 2.35 «Ветэрынар у дзікай прыродзе».
22.00, 3.30 «Хуткасць жыцця».
22.55, 4.25 У пошуках Каралеўскай кобры.
23.50, 5.20 Дзікія і небяспечныя.
0.45 Медуза-забойца.

### ЗДАРОЎЕ

5.00, 11.40, 16.10, 20.00, 2.40 Набалелае пытанне.
5.50, 20.50 Я расту.
6.30, 21.30 Сакрэты здароўя.
6.55, 21.55 Кабінет прыгажосці.
7.35, 22.35 Ты тое, што ты ясі.
8.00, 12.30, 23.00, 3.30 Энцыклапедыя памылак.
8.30, 23.30 Здароўе ад зоркі.
9.20, 12.45, 18.50, 0.20, 3.45 Азбука здароўя.
9.25, 0.25 Цела чалавека.
9.55, 0.55 Дзіцячая медыцына.
10.30, 1.30 Панацэя.
11.00, 2.00 Пра дыеты і не толькі.
12.50, 3.50 Клінічны гіпноз.
13.30, 4.30 Зялёная аптэка.
14.00 Правілы здароўя.
14.35 Жыццё або Смерць?
15.00 Вялікая прабежка.
15.40 Гісторыя хвароб.
17.00 Як не страціць здароўе.
17.40 Жаночы часопіс.
18.20 Колькі вам гадоў?
18.55 Увага, ежа!
19.30 Дзіця нарадзілася.

### ТДК

6.00, 7.50, 16.55, 17.50, 18.50, 1.30 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 15.00, 22.20 Усё лепшае, для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00 Шлях поспеху.
13.00, 2.00 Нашы дзеці.
14.00, 4.00 Твой дом.
16.00, 20.00 «Ваш асабісты псіхолаг».
17.00, 23.30 Красуня.
19.00, 22.30 Люстэрка жыцця.
21.00, 0.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
3.00 Гісторыя поспеху.

## ЧАЦВЕР, 20 СТУДЗЕНЯ

### ПЕРШЫ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.45 Навіны.
6.05, 0.35 Дзень спорту.
6.10, 7.10, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45 Nota Bene.
7.05, 8.10, 18.50, 0.30 Зона Х.
7.30, 8.30, 11.55 Дзелавое жыццё.
8.35 Зямельнае пытанне.
9.10, 19.55 Серыял «Маргоша».
10.05, 17.05 Серыял «Маршрут міласэрнасці».
10.50, 17.50 Серыял «Маруся».
11.40 «Беларуская эканоміка: інвестыцыі ў будучыню».
12.10 Камедыя «Квартэт для дваіх».
14.05 «Мая праўда». «Міраж».
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.35 «Зброя».
15.50 «Фартыфікацыя».
16.30 «Гарачыя кропкі».
19.25 «КЕНО».
19.30 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «Падмані мяне».
22.55 Камедыя «Каханне і танцы».

### АНТ

6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Мая жонка мяне прываражыла». Серыял.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20 Навіны спорту.
11.10 «Сэкс-сімвалы. Жанчыны».
12.20 «Дэтэктывы».
13.10 «Кантрольная закупка».
13.45 «Модны прыгавор».
14.50 «Зразумець. Даравацъ».
15.25 «Хачу ведаць».
16.15 «Заручальны пярсцёнак». Серыял.
17.05 «Слова жанчыне». Серыял.
18.20 «Шчаслівыя разам». Серыял.
18.55 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 «Доктар Тырса». Серыял.
22.05 «Капітан Гардзееў». Серыял.
23.25 «Выратаваць любой цаной».
0.25 «Віёла Тараканава. У свеце злачынных страсцяў». Серыял.
1.15 Начныя навіны.

### ЛАД

6.35, 22.50 Серыял «Універ».
7.00 ЛАДная раніца.
8.00, 21.10 Тэлебарометр.
8.05, 22.15 Серыял «Інтэрны».
8.35 Серыял «Чыста англійскія забойствы».
9.40, 18.00 Серыял «Ты маё жыццё».
10.45 Камедыя «Дзяўчаты».
12.30 Жансавет.
13.05 «Бітва экстрасэнсаў».
14.10 Серыял «Сіла прыцяжэння».
15.05 Пазакласная гадзіна.
15.25 Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
16.50 «Халі-галі». Скетч-шоу.
17.05, 23.25 Серыял «Налётчыкі».
19.05 Кінааповесць «Печкі-лавачкі».
20.55 Калыханка.
21.15 Беларуская часінка.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10 «СТБ-спорт».
8.30, 20.25 «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
9.30 «Скардзіцца дазволена».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 «Багатая і каханая». Серыял.
11.30 «Далёкія сваякі».
11.40, 17.30 «Званая вячэра».
12.35, 18.30 Серыял «Дарослыя гульні».
13.50 «Дурні, дарогі, грошы». Серыял.
14.40 «Студэнты International». Серыял.
15.30, 22.55 «Выкраданне багіні». Серыял.
16.50 «Добры дзень, доктар!».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
21.30 «Праўда».
22.05 «Аўтапанарама».
23.45 «Інструктар». Серыял.

### МІР

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 19.00 Серыял «Прынцэса цырка».
6.05 «Цік-так».
6.20 «У гасцях у Вітамінкі».
7.05 «Сардэчна запрашаем».
7.35 Серыял «33 квадратныя метры».
8.05, 22.05 «Жывая гісторыя: Ярузельскі».
9.05, 18.30, 2.05 «Тут быў я».
9.35 «Садружнасць LIVE».
10.05, 2.30 Серыял «Ваўчыха».
11.05, 3.30 Маст. фільм «Крадзеж».
13.05 М/с «Мільён гадоў да нашай эры».
13.30 Серыял «Старшакласнікі».
14.05 Серыял «Люба, дзеці і завод».
14.30 «Адкрытая размова».
15.20 «Культурны слой з Львом Лур'е».
16.05, 23.05 Серыял «Вылечванне каханнем».
17.05, 0.05 Ток-шоу «Слова за слова».
18.20 «Акцэнты».
19.50, 1.05 Серыял «Вогнезмагары».
20.45 «XX стагоддзе: найвялікшыя моманты гісторыі».
21.20 «Дыяспары».

### 8 КАНАЛ

7.00, 10.55, 12.40, 14.35, 16.55, 18.35, 19.40, 21.00, 23.30 «Надвор'е».
7.05, 17.30 Серыял «Прытворшчык».
8.15, 16.25 «Аповеды пра жывёл».
8.40, 15.40 «Кінаблакнот».
9.00 «Марока вачыма гурмана».
9.30, 16.00 Мультпарад.
10.00, 19.45 Серыял «Гарац».
11.00 Дэтэктыў «Лёс рэзідэнта».
12.45 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».
14.40, 18.40 Серыял «Ракіроўка».
17.00 «Мой любімы гадаванец».
20.45 «Вечарніца».
20.55 «К-гульні» — «Лайт».
21.05 Камедыя «Авантурысты».
23.05 Знаёмствы «Life».

### ВТБ

6.00, 23.30 «PLAY».
8.00, 18.00, 23.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 13.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00, 15.00, 19.00 Серыял «Ранеткі».
11.00, 14.00 Серыял «Цуды. com».
12.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
16.00 Камедыя «Мільярды Бэйлі».
21.00 Камедыя «Кватарант».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
9.20, 18.50 Серыял «Еўфрасіння».
10.10 «Чортава кола Арно Бабаджаняна». Дак. фільм.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 17.20 «Кулагін і партнёры».
12.00, 20.30 Серыял «У лясах і на гарах».
13.50, 16.50, 19.50, 23.20 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.25 «Сапраўднае жыццё».
16.15 Серыял «Дворык».
17.50 Серыял «Чорная багіня».
22.20 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
23.30 «Весткі.ru».
23.45 «Паядынак».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15 Сёння.
6.05 «НТБ раніцай».
8.35 Серыял «Таксістка».
9.30, 15.35, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
10.20 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.50 «Жывуць жа людзі!».
11.20 «Праспяванае ў СССР».
12.05 «Да суда».
13.30 Серыял «Ментоўскія войны».
15.10 «Справа густу».
16.30 Серыял «Эра стральца».
19.35 Серыял «Павуцінне».
21.25 Серыял «Зверабой».
23.40 Серыял «Шпіёнскія гульні».

### ТНТ

5.00 «Невытлумачальна, але факт».
6.00, 11.40 «Нікеладэон на ТНТ».
7.30, 0.00 «Камедзі клаб».
8.30, 17.00, 19.00 «Універ». Сітком.
9.30, 18.00 «Жаночая ліга: хлопцы, грошы і каханне».
10.00, 18.30 Серыял «Шчаслівыя разам».
10.45 М/с «Тасманскі д'ябал».
12.30 М/с «Бэтмен: адважны і смелы».
13.00 «Жаночая ліга».
13.30, 22.00, 3.40 «Дом-2».
15.00 «Дзённікі нянькі». Меладрама.
17.30, 19.30 Серыял «Рэальныя хлопцы».
20.00 Камедыя «Супер Макгрубер».
23.30 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
1.00 «Сябры». Серыял.
1.50 «Апошні паварот». Баявік.
4.45 «Камедыянты».

### ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10 Раніца з Інтэрам.
9.10, 5.05 Адзін у полі.
9.55, 16.45, 0.50 Серыял «Простыя ісціны».
10.50, 16.15, 1.45 Серыял «Свая каманда».
11.15, 20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.15 Знак якасці.
12.45 Маст. фільм «Карпаты, Карпаты...». 1 серыя.
14.05, 22.05 Маст. фільм «Гросмайстар».
15.35, 0.10 Судовыя справы.
17.40, 2.15 Серыял «Танга ўтраіх».
18.25, 3.30 Серыял «Агонь кахання».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
21.20, 5.50 Серыял «Невідзімкі».
23.35 Легенды крымінальнага вышуку.
6.35 Феерыя падарожжаў.

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.30, 18.30, 22.30 Навіны культуры.
9.15, 18.45 Галоўная роля.
9.30, 0.50 Праграма перадач.
9.40, 22.50 «Вясна Мікеланджэла». Маст. фільм.
11.15 «Бяроста-бяроста». Дак. фільм.
11.25 «Па той бок казкі. Барыс Рыцараў». Дак. фільм.
12.05 «Калі рымляне правілі Егіптам». Дак. фільм.
12.50 «Стагоддзе Рускага музея».
13.20 «Адкрытая кніга». Маст. фільм.
14.40 «Зверапорт». М/с.
14.50 «Шайбу! Шайбу!». М/ф.
15.10 «Чарадзейнае дрэва». Серыял.
15.40 «Маёнтак сурыкатаў». Дак. серыял.
16.05, 22.00 «Пакажам люстэрка прыродзе...».
16.30, 1.40 «Сусветныя скарбы культуры».
16.45 Расійскія зоркі сусветнай оперы. Дзінара Аліева.
17.40, 0.55 «Шукальнікі». «Руская Атлантыда: Кіцеж-горад — у пошуках зніклага раю».
19.05 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
19.45 Да 105-годдзя з дня нараджэння Ігара Маісеева. «Які стварыў танец».
20.25 Загадкі гісторыі. «Гладыятары». Дак. фільм.
21.15 «Культурная рэвалюцыя».
0.35 Музычны момант.

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Мы — клоўны».
5.30 «Камера глядзіць у свет». 1986 г.
6.20 «Канцэрт савецкай песні». 1983 г.
6.40, 12.40, 18.40 Дэтэктыў «Калье Шарлоты».
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.10 «Вакол смеху».
11.00 «Успаміны пра Арно Бабаджаняна».
12.10 Фільм пра палітычную адказнасць КПСС перад народам. 1991 г.
16.00 «Мікалай Трафімаў». Дак. фільм.
17.00 «Мы — маладая гвардыя. Спадчыннікі». Дак. фільм.
18.00 «Будзільнік». 1983 г.
22.10 «Тэма» з У. Лісцьевым: «Найміты». 1993 г.
23.00 «... Да 16 і старэйшым». 1992 г.
23.45 «Шафёрская балада». Дак. фільм.
0.40 «Наташа». Маст. фільм.
4.10 «Спяваюць Ігар Нікалаеў і Наташа Каралёва». 1994 г.

### MTV

5.00, 0.50 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
7.35, 23.05 Тайныя спакусы курортнага гатэля.
7.50, 22.40 Наступны.
8.30, 23.30 Шалёныя продкі.
8.55, 23.55 Магія Крыса Энджэла.
9.20 Праўда жыцця: Я — геній...
10.10 Цяжарная ў 16.
11.00 Немагчымае магчыма.
11.50 Праверка чутак.
12.15, 18.50 News блок.
12.25, 17.30 «Подыум».
13.45, 21.25 «Два з паловай чалавекі». Серыял.
14.10, 20.55 «Усё лепшае ў табе». Серыял.
14.35, 19.00 «Ранеткі». Серыял.
15.35, 20.00 «На службе ў д'ябла». Серыял.
16.30 Бісся і спявай.
21.50 «Клініка». Серыял.
22.15 «Клава, давай!». Серыял.
0.20 Кіначарт.

### НАША КІНО

6.30, 12.30 Кінааповесць «Мой сябар Іван Лапшын».
8.30, 14.30 Маст. фільм «Канец імператара тайгі».
10.30, 16.30 Дэтэктыў «Мытня».
18.30, 0.30 Маст. фільм «Галава Гаргоны».
20.30, 2.30 Маст. фільм «Русь спрадвечная».
22.55, 4.55 Маст. фільм «Майская ноч, або Тапельніца».

### ДОМ КІНО

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Падары мне жыццё».
3.50 Баявік «Мядзведжае паляванне».
5.50 Маст. фільм «Дульсінея Табоская».
8.00 Камедыя «Афоня».
9.30 Трылер «Чызкейк»,
11.50 Меладрама «Госць».
12.20 Камедыя «Кубанскія казакі».
14.05 Меладрама «Безыменная зорка».
16.15 Маст. фільм «Марскі паляўнічы».
17.25 Меладрама «Я Вам больш не веру».
19.50 Меладрама «Жаночыя слёзы».
21.25 Камедыя «Каўказская палонніца, або Новыя прыгоды Шурыка».
22.40 Драма «Люстэрка для героя».
0.55 Маст. фільм «Чучала».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00 Маст. фільм «Чужая кампанія».
6.05, 10.05, 14.05 М/с «Пастка для Бамбра». М/ф: «У лясным гушчары», «Краіна Аркестрыя».
7.00, 11.00 Казка «Блазан Балакіраў». М/ф: «Волатаўская каша», «Пазалочаныя лбы», «Улюблівая варона».
8.00, 12.00 Казка «Чурыдзіла». М/ф: «Рыжая котка», «Хлопчык як хлопчык», «Воўк і цяля», «Здарылася гэта ўзімку».
13.00 Маст. фільм «Каштанка».
15.00 Фільм-казка «Вясёлы сон або смех і слёзы». 1-я серыя.
16.05 М/с «На задняй парце». М/ф: «Самы малодшы дождж», «Вясёлая карусель» № 11, «Паравозік з Рамашкава», «Як вярблюдзяня і ослік у школу хадзілі».
17.00 Казка «Мяжа». М/ф: «Раз-гарох, два-гарох...», «Айбаліт і Бармалей», «Перапынак № 6».
18.00 Казка «Мыш і вярблюд». М/ф: «Салют, Алімпіяда!», «У порце», «Камарынская».

### ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Іваноў і Рабіновіч».
20.00, 2.00 Серыял «Мент у законе».
21.00 Серыял «Ментоўскія войны-5».
22.00, 23.30 Серыял «Яры».
3.00 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі». 1-я серыя.

### ТБ3

5.00 М/ф «Бэтмен будучыні».
5.30, 1.00 Серыял «Альф».
6.00, 1.30 Дак. фільм «Трэцяя планета ад сонца».
6.30, 15.30 «Як гэта зроблена».
7.00, 14.30 Разбуральнікі міфаў.
8.00, 2.00 Дак. фільм «Сучасныя цуды».
9.00, 18.00 Серыял «Медыум».
10.00, 19.00 Серыял «Вітая лесвіца».
11.00 Дак. фільм «Апакаліпсіс».
12.00 Дак. фільм «Гарадскія легенды».
12.30 Маст. фільм «Зло, якое выжыла».
16.00, 0.00 Серыял «Чорная метка».
17.00 Дак. фільм «Ордэны оптам і ў розніцу».
21.00 Маст. фільм «Кропка перарывання».
23.00 Серыял «Вавілон-5».
3.00 Серыял «Анёл».
4.00 Серыял «Зена — каралева воінаў».

### ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Трылер «Чорная скрыня».
10.35, 18.35, 2.35 Драма «Акіян».
12.30, 20.30, 4.30 Серыял «Спецыяльнае падраздзяленне».
13.25, 21.25, 5.25 Меладрама «Мы тут больш не жывём».
15.10, 23.10, 7.10 Баявік «Адхіленне ад нормы».

### 22.55 ФІЛЬМ ДНЯ

**«КАХАННЕ І ТАНЦЫ»**

(ЗША, 2008 г.)

Як толькі журботная настаўніца англійскай мовы Джэсіка сустракае былога чэмпіёна, прызёра конкурсу танца свінг Джэйка, паміж імі ўспыхвае іскра ўзаемнай сімпатыі. Але ў Джэсікі ёсць жаніх-працаголік, а ў Джэйка яго былая партнёрка па танцах.

**Рэжысёр** — Роберт Айскоў. **У ролях:** Білі Зэйн, Кэралайн Перлман, Рэйчал Дрэч.



### ТБ1000

3.00, 20.50 Камедыя «Самы лепшы тата».
5.00 Драма «Аўгуст».
7.00 Камедыя «Звярынец».
9.00 Камедыя «Каманда».
11.10 Камедыя «Каханне і іншыя катастрофы».
13.00 Камедыя «Надзвычайная жонка».
15.00 Драма «13 гутарак пра адно».
17.00 Камедыя «Дзіўныя сваякі».
19.00 Драма «Сястрычка Бэці».
22.30 Драма «Унутраная імперыя».
1.30 Трылер «Шантаж».

### DIVA UNIVERSAL

5.00, 3.20 Серыял «Вайна Фойла».
6.35, 12.30, 18.20 Серыял «Дамы сям'і Гілмор».
7.25 Маст. фільм «Пытанне жыцця і спаткання».
8.50 Маст. фільм «Ганна Карэніна».
10.50 Серыял «Джордан расследуе».
11.40, 19.10 Серыял «Добрая жонка».
13.25 Камедыя «Перш чым скажаш «так».
15.00 Трылер «Выкрадзеная цнатлівасць».
16.40 Серыял «Шпік».
20.00 Камедыя «Бландзінка ў законе 2».
21.40 Маст. фільм «Злачынствы моды: забойная стрыжка».
23.20 Драма «Тайны нераскрытых злачынстваў».
0.10 Маст. фільм «Інспектар Мама: выкраданне ў рытме вальса».
1.50 Маст. фільм «За сцяной».

### РАМАНТЫКА

7.00, 16.55, 21.20, 5.20 «Тайна Лауры».
7.55, 10.40, 20.30 «Анучная лялька».
8.50, 14.10, 0.55 «Ніколі не позна?».
9.45, 15.05, 3.35 «Сямейныя вузы».
11.30, 17.45, 2.40 «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
12.25, 1.50, 6.10 «Жанчыны на сцежцы вайны».
13.20, 23.05, 4.30 «Дора на варце парадку».
16.00, 19.35, 22.10 «Дасканалая прыгажосць».
0.00 «Інтымнае жыццё звычайных людзей».

### AXN-SciFi

0.35, 6.30, 19.15 Мёртвая зона.
1.20, 18.30 4400.
2.00, 4.35, 13.45, 23.30 Bleach.
2.25, 9.15 Зена.
3.10, 5.45, 13.00 Зорны крэйсер Галактыка.
3.50, 10.00, 23.55 Медыум.
5.00, 12.15, 17.45 Зорныя Вароты.
7.15, 14.15, 21.30 Звышнатуральнае.
8.00, 15.00, 22.15 Чорная лагуна.
10.45, 16.15 Кайл XY.
20.00 Эўрыка.

### EUROSPORT

4.00, 0.00, 2.00 Тэніс. Australian Open.
15.30, 23.00 Біятлон. Кубак свету.
16.45 Зімовыя віды спорту. Скачкі з трампліна. Адам Малыш (Польшча).
17.00, 20.30 Ралі. Серыя IRC.
18.45 Скачкі з трampліна. Кубак свету.
20.00, 1.30 «Гейм, сэт і матч».
21.00 Байцоўскі клуб.

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 18.00 Суперзбудаванні.
6.00, 14.00 Вялікія міграцыі.
7.00, 12.00 «Падарожжа па планетах».
8.00, 13.00 Вампіры ў Венецыі.
9.00, 15.00 Небяспечныя сустрэчы.
10.00, 16.00, 4.00 Амерыканскія гонкі.
11.00, 19.00 Мегаполісы.
11.30, 19.30 «Вясёлая навука».
17.00 Расследаванні авіякатастроф.
20.00, 23.00, 2.00 Куба.
21.00, 0.00, 3.00 Адзін акіян.
22.00 Суперзбудаванні старажытнасці.
1.00 Рэальнасць або фантастыка?
1.30 Секунды да катастрофы.

### DISCOVERY

7.00 «Хлам? Не, машына!».
7.25, 15.15 Брудная работка.
8.20, 19.00, 5.10 Як гэта ўстроена?
8.50, 19.30, 5.40 «З чаго гэта зроблена?».
9.15, 18.00, 3.50 Разбуральнікі легендаў.
10.10, 2.55, 6.05 Лабараторыя выбуховых ідэй.
11.05 Выжыць любой цаной.
12.00, 17.05, 21.00, 2.00 Зброя будучыні.
12.55, 20.00, 1.00 «Top Gear».
13.50 Круты цюнінг.
14.45 «Пятая перадача».
16.10, 0.00 «Бяспека межаў».
22.00 SOS!
23.00 Выжыць у катастрофе.
4.45 «Маланкавыя катастрофы».

### TRAVEL

5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 2.00 Сусветны падарожнік.
6.00, 12.30 Раскошныя падарожжы з Варунам Шармай.
7.00 Падарожжы гурмана.
8.00, 15.30 Сафі Грыгсан на ўсходнім базары.
8.30, 13.30 Падарожжы сёння.
9.00 Аўстралія.
11.00, 16.00 Кулінарная Азія.
12.00 Падарожжа са смакам.
15.00 Паглядзець за 48 гадзін.
18.00, 23.00 Экзотыка ў жыцці.
19.00, 0.00 Зямля качэўнікаў.
20.00, 1.00 Па рэйках.
22.00, 3.00 Блакітны кантынент.
4.00 Маляўнічыя чыгункі.
4.30 Вялікая рыба.

### ANIMAL PLANET

7.00 Маёнтак сурыкатаў.
7.25 Планета дзікіх.
7.50 «Прыгоды панды».
8.40 Усё пра сабак.
9.10, 6.10 «Самыя нясцерпныя ручныя жывёлы Брытаніі».
10.05 Выратаванне відаў.
11.00 «Тэрыторыя жывёл».
11.55 «SOS дзікай прыроды».
12.50 Паліцыя Х'юстана: аддзел па абароне жывёл.
13.45 «Шатландскае таварыства абароны жывёл».
14.10 Ветэрынары-стажоры.
14.40 У мяне завёўся насарог!
15.30, 20.10 Перакладчык з сабачай.
16.30 Як стаць...
17.25 Сабакі, коткі і іншыя ўлюбёнцы.
18.20 «Ветэрынар у дзікай прыродзе».
19.15, 1.40 Уводзіны ў сабаказнаўства.
21.05, 2.35 Паляўнічы на яд.
22.00, 3.30 На волю з пітбулем.
22.55, 4.25 Здабыча — чалавек.
23.50, 5.20 Дзікія і небяспечныя.
0.45 Паветраныя сківіцы.

### ЗДАРОЎЕ

5.00, 17.00, 20.00 Правілы здароўя.
5.35, 20.35 Дзіцячая медыцына.
6.00, 21.00 Вялікая прабежка.
6.40, 21.40 Гісторыя хвароб.
7.10, 17.40, 22.10 Набалелае пытанне.
8.00, 23.00 Пазнай сябе.
8.35, 23.35 Я перамог гэты боль.
9.10, 0.10 Памылкі здароўя.
9.50, 12.20, 15.50, 18.45, 0.50, 3.20 Азбука здароўя.
9.55, 12.25, 0.55, 3.25 Ты тое, што ты ясі.
10.30, 1.30 Не выходзячы з дому.
11.00, 2.00 Нетрадыцыйная медыцына.
11.40, 2.40 Выкрыццё прадуктаў.
12.55, 3.50 Школа розуму.
13.35 Жыццё або Смерць?
14.00 Як не страціць здароўе.
14.40 Жаночы часопіс.
15.20 Колькі вам гадоў?
15.55 Увага, ежа!
16.30 Я расту.
18.30 Энцыклапедыя памылак.
18.50 Клінічны гіпноз.
19.30 Зялёная аптэка.
4.30 Курс лячэння.

### ТДК

6.00, 7.50, 12.50, 14.10, 16.55, 17.50, 18.50, 1.30 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 15.00, 22.20 Усё лепшае, для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00 Шлях поспеху.
13.00 Філасофія здароўя.
13.30, 2.00 Нашы дзеці.
14.30 Маю права.
16.00, 20.00 «Ваш асабісты псіхолаг».
17.00, 23.30 Красуня.
19.00, 22.30 Люстэрка жыцця.
21.00, 0.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
3.00 Гісторыя поспеху.
4.00 Твой дом.

Тэлесеткі

# «СПЯЦЬ І МЫШКІ, І СТРЫЖЫ...»

## Беларуская «Калыханка» святкуе 30-годдзе выхаду ў эфір

**Куды падзеўся Дзед Барадзед, і ці ўбачым мы зноў парася Сеню? Дзіцячая «Калыханка» адзначае 30-гадовы юбілей. У дзень нараджэння стваральнікі праграмы расказалі журналістам пра планы і ўзгадалі, з чаго ўсё пачыналася.**



— Трыццаць гадоў таму ўзнікла ідэя стварыць дзіцячую праграму кшталту «Спокойной ночи, малыши», толькі яе беларускі варыянт, — успамінае **карэспандэнт спецыяльнага аддзела падрыхтоўкі тэлепраграм для дзяцей і юнацтва галоўнай дырэкцыі тэлевытворчасці і аўтар многіх сцэнарыяў «Калыханкі» Алена ФУРСАВА**. — Доўга думалі над назвай — хацелі, каб гэта была ўсё ж беларуская назва. Казалі, што Ніна Шоба, на той час рэдактар галоўнай рэдакцыі, неяк прысніла назву «Калыханка», ад беларускага слова «калыхаць». Так і зацвердзілі. Першыя праграмы былі больш статычнымі, пазней мы прыдумалі выязныя выпускі. Ездзілі і ў Ташкент, і ў Маскву.

З «Калыханкай» Алена Фурсава працуе ўжо 25 гадоў, і значную частку з іх Алена Сяргееўна правяла ў кадры — побач з казачнымі персанажамі. Узгадваючы легендарнага Дзеда Барадзеда, жанчына прызнаецца:

— Персанаж Дзеда Барадзеда ўнікальны. Яго вадзілі адразу тры акцёры, а чацвёрты агучваў. Акцёры былі ў чорным, самога Дзеда таксама здымалі на чорным фоне — гэта давала магчымасць пры мантажы пераносіць яго ў любое месца. Атрымаўся такі ўдалы беларускі персанаж, ды і песню падабралі добрую. Але кожная лялька мае свой знос. З цягам часу Барадзед пачаў асыпацца, у яго пачалі адвальвацца вусы і барада. А паколькі цыкл перадач з яго удзелам быў вельмі працаёмкім, паступова Дзед Барадзед заняў сваё месца ў музеі.

### КУДЫ СХАВАЦЬ АКЦЁРА, АЛЬБО ПРА ЖЫЦЦЁ ЛЯЛЬКАВОДАЎ

— Сцэнарысты часам такога напанісваюць, — са смехам узгадвае акцёр Уладзімір Баранкоў — голас медзведзяняці Топы. — «Топа спусціўся з дрэва, вісіць галавой уніз, у лапах трымае галінку»... Я ўсё разумею, вядома, але важней пытанне: куды схаваць мяне? — смяецца акцёр. — Але даводзіцца выкручвацца. За ўсе гады я налаўчыўся нават Топавай лапай пісаць у сшытку каліграфічным почыркам...

У «Калыханку» я трапіў з лялечнага тэатра. Сёння, праз 25 гадоў, тут і працую. У мяне ўжо сын вырас, унучка падрастае, а вобраз Топы ўсё яшчэ актуальны. Самае цікавае — здымкі. Яны праходзяць звычайна на «кватэры», але бываюць і на адкрытым паветры. Гэта заўсёды вельмі смешна: лялек у кадры тры — трое лялькаводаў ніцма ляжаць на падлозе. Карцінка, зразумела, камічная. Ногі часам так пераплецены, што паглядзіць чалавек недасведчаны — і яшчэ падумае невядома што (*смяецца*. — **Аўт**.). Але пад сталом такое ж «калыханачнае жыццё» (яшчэ весялей), як і на стале. Сядзіш, бывае, там, і разам з Янай шнуркі Маляванычу звязваеш... (*смяецца*. — **Аўт**.)

### ЦІ ВЕРНУЦЬ ДЗЕДА БАРАДЗЕДА?

— Калыханка — насамрэч самая ўзроставая праграма беларускага тэлебачання. Старэйшай праграмы вы не знойдзеце, — гаворыць **галоўны рэдактар галоўнай дырэкцыі тэлеканала «ЛАД» Сяргей КУХТО**. — Змяняецца час, з'яўляюцца новыя праграмы, але «Навіны» і «Калыханка» ідуць без спынення. І здраджваць традыцыям мы не збіраемся.

Вяртаць Дзеда Барадзеда ў «Калыханку» пакуль не плануецца. Але, як адзначае кіраўніцтва канала, цалкам магчымае вяртанне гэтага і іншых лялечных герояў у іншыя дзіцячыя перадачы. Адказваючы на пытанне, ці магчыма зрабіць «Калыханку» штодзённай, Сяргей Кухто патлумачыў, што ў выхадныя канал больш, чым у будні, залежыць ад спартыўных трансляцый.

— Паколькі час прамой трансляцыі рэгулюецца па-за межамі Беларусі, мы не можам гарантаваць, што вечаровыя выпускі «Калыханкі» будуць пастаяннымі. Многія трансляцыі прыпадаюць якраз на гэты час. Падводзіць дзетак мы не хочам, таму па выхадных праграма не выходзіць.

З 17 студзеня ў перадачы пачнецца паказ расійскага мульціка «Маша і мядзведзь». Як прызнаўся Сяргей Кухто, «ЛАД» ужо закупіў усе серыі папулярнага мультфільма. У бліжэйшых планах тэлеканала — запіс дыскаў з выпускамі «Калыханкі».

**Ілья ЛАПАТО.**

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

**Упершыню «Калыханка» выйшла ў эфір у студзені 1981 года. Першымі героямі дзіцячай праграмы былі лялечны хлопчык Бульбінка і яго Дзядуля, якія расказвалі дзецям казкі ў прамым эфіры. За 30 гадоў існавання лялечныя персанажы змяняліся і адаптаваліся да часавых рэалій: гледачы могуць узгадаць Дзеда Барадзеда, Бусліка, Лесавічка, Васілінку і Васілька, ката Марціна, ваўка Вову, парася Сеню, лісічку Яну, медзведзяня Топу і інш.**

## Пажывіліся

### МАЛАДЫ ДЫ СПРЫТНЫ

У 25 гадоў жыхар Баранавіч заняў пасаду начальніка ўчастка аптовага гандлю аднаго ААТ і з 2008 года пачаў пацыху красці спецадзенне і гаспадарчы інвентар. І накраў амаль на 56 мільёнаў рублёў. Злодзею давялося страту вярнуць, але справа не закрыта.

### НІ ЛАМІНАТУ, НІ ГРОШАЙ

У Пінску дырэктар аднаго прыватнага прадпрыемства паабяцаў 9 жыхарам Брэста прывезці з Польшчы ламінат. Людзі заплацілі дырэктару 130 млн рублёў, але пакрыцця для падлогі не дачакаліся. Давялося пацярпелым пісаць заявы ў міліцыю.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**АДКАЗЫ НА СКАНВОРД**

**Па гарызанталі:** Тэлеграф. Крыга. Пясок. Лыжка. Бора. Ліга. Атрута. Нуль. Ток. Том. Молат. Бруд. Сад. Руно. Зух. Радар. Арэлі. Лапік. Факстрот. Край. Ура. Тут. Абрубак. Араб. Тарас. Атара. Кош. Агат. Тэлефон. **Па вертыкалі:** Мазанка. Жолаб. Хала. Райт. Шомпал. Тустэп. Управа. Ода. Ліст. Факс. Дзік. Атака. Робат. Карат. Трыко. Арак. Рак. Абарот. Абат. Саша. Рама. Сыр. Рант. Талмуд. Руб. Нагора. Створ. Таксафон.

Хочаце — верце...

# КАБ КАШАЛЁК БЫЎ ПОЎНЫ ГРОШАЙ...

**ВЯДОМА, прыемна, калі ў вас ёсць прыгожы кашалёк — не з поліэтылену і скуразаменніка, а з натуральнай скуры або замшы. Але яшчэ прыемней, калі ў ім не пераводзяцца грошы, і не толькі дробязь, а і буйныя купюры. Невыпадкова навукоўцы выявілі, што, пералічваючы грошы, можна нават сцішыць фізічны боль.**

А вось як зрабіць, каб ваш кашалёк заўсёды быў поўны? Ну, пра эканомію і ўменне збіраць грошы расказана шмат. Але яшчэ існуюць прыкметы і пэўныя спосабы, дзякуючы якім змесціва вашага кашалька вас будзе пастаянна цешыць.

Пачнём з найважнейшага — з выбару самога кашалька. І гэта не так проста, таму што не ва ўсякім кашальку будуць ахвотна заводзіцца грошы. Напрыклад, дрэннай якасці кашалькі, партманеты, зробленыя з танных матэрыялаў абы-як, самі па сабе ўжо нясуць пячатку і энергію беднасці. Так што, вырашыўшы зэканоміць на набыцці кашалька, не абурайцеся потым, што буйныя купюры ў ім з'яўляюцца вельмі рэдка.



Але і імкнуцца патраціць шалёныя грошы за дызайнерскі асобнік таксама няма ніякага сэнсу. **Ваш кашалёк павінен быць грунтоўным, але ў той жа час стыльным і элегантным. І абавязкова скураным або замшавым.** Гэта важна таму, што поліэтылен, любы пластык або заменнік не нясе ніякай матэрыяльнай энергіі і ніяк не будзе ўплываць на тое, што павінна знаходзіцца ў кашальку. Больш за тое, штучныя матэрыялы будуць перакрываць доступ натуральнай энергіі. Вось чаму скура і замша лепш, хоць і даражэйшыя.

Паводле старога павер'я **ў вашым кашальку абавязкова павінна знаходзіцца неразменная дробная купюра,** якая, па сутнасці, будзе з'яўляцца знакам грошай. Пакласці яе трэба асобна і ніколі не расходаваць, таму што яе прызначэнне — прыцягваць багацце.

Ёсць яшчэ народная прымета: **каб у кашальку вадзіліся грошы, пакладзіце ў яго кавалачак кораня хрэну,** які канцэнтруе ў сабе вялікую колькасць матэрыяльных энергій. Можна корань купіць, але значна лепш будзе, калі вы яго выкапаеце самі, высушыце і пакладзяце ў кашалёк так, каб карэньчык не згубіўся.

**Прыцягне грошы ў ваш кашалёк і галінка верасу,** якую трэба пакласці ў маленькую кішэньку і дбайна берагчы, каб яна не паламалася і не згубілася.

Многія людзі запаўняюць кашалёк крэдытнымі і дысконтнымі карткамі, квітанцыямі, цыдулкамі, фотаздымкамі — усім тым, што павінна быць пад рукой. Калі вы хочаце прыцягнуць багацце, то **ў вашым кашальку павінны знаходзіцца толькі грошы**, а ўсё астатняе можна насіць у візітоўніцы або ў прызначаным для гэтага партманеце.

Ну і, вядома, не варта забываць, што, каб грошы ў вас у кашальку былі, трэба іх адтуль не толькі вымаць, але і класці, ды і расходаваць асцярожна, а не выкідваць на вецер.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.21 | 16.16 | 7.55 |
| Віцебск — | 8.17 | 15.59 | 7.42 |
| Магілёў — | 8.11 | 16.06 | 7.55 |
| Гомель — | 8.00 | 16.10 | 8.10 |
| Гродна — | 8.35 | 16.32 | 7.57 |
| Брэст — | 8.28 | 16.41 | 8.13 |

**Месяц**

*Першая квадра 12 студзеня. Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**

***Пр.** АБРЭЗАННЕ ГАСПОДНЯЕ, Аляксандра, Васіля, Вячаслава, Івана, Мікалая, Міхаіла.*

***К.** Марыны, Ніны, Гіляра, Фелікса.*




## 14 студзеня

Дзве даты



**1893 год** — нарадзілася Канстанцыя Буйло, беларуская паэтэса, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Першую кнігу паэткі «Курганная кветка» адрэдагаваў Я. Купала. Аўтар кніг паэзіі «Май», «Світанне», «На абноўленай зямлі», зборнікаў вершаў для дзяцей, п'ес. У сваёй творчасці шырока выкарыстала фальклорныя матывы, вобразы народнай міфалогіі. Многія вершы паэтэсы пакладзены на музыку. Шырокую вядомасць займела песня «Люблю наш край», якая стала народнай.

**1896 год** — нарадзіўся Іеранім Убарэвіч, савецкі ваенны дзеяч, камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі (1931—1937 гг), камандарм 1-га рангу. Неабгрунтавана рэпрэсаваны ў сувязі з так званай справай Антысавецкай трацкісцкай ваеннай арганізацыі. Рэабілітаваны пасмяротна.

Цытата дня:

*«Рухаючыся наперад, нашы веды пастаянна перакрэсліваюць самі сябе».*

**Віктор Гюго (1802—1885), французскі пісьменнік.**



# СЕМЕНА — ПОЧТОЙ.

## Со своего огорода

Много лет выращиваю овощи на своём огороде с минимальным поливом и без плёнки. Отбираю самые урожайные и ценные, адаптированные к местным условиям, и заготавливаю их семена, которые и предлагаю овощеводам-любителям.

**Бахчёвые.** Дыня **Белорусская ранняя** (до 4 кг). Арбуз **Бобруйский** – до 7 кг. В жаркие и теплые годы все созревают в августе.

**Тыквы.** **Титан** – чемпион среди тыкв, до 100 кг. **Кавбуз** – тыква мягкокорая, до 40 кг. **Сдобная пышка** (до 10 кг) сладкая, хранится всю зиму в доме, вкусен и полезен сок и каши из нее. **Лечебная** – семена буро-зелёные, без кожуры, богатые цинком и хлорофиллом.

**Кабачки.** **Белый якорь** – белые, скороспелые. **Вьетнамский** – спелые, очень сладкие, с плотной оранжевой мякотью, можно кушать сырыми, как морковку, и делать сок.

**Огурцы.** *Очень ранние* – **Малыш.** *Ранние* – **Пальчик** (долго и обильно плодоносят). *Ранне-средние* – **Капелька, Верасень, Конкурент, Свитанак, Зарница**, **Славянские.** Все огурцы мелкие, засолочные, устойчивые к болезням.

**Помидоры.** ***Ультраранние*** **– Альфа** и **Чиполлино** (до 100 г, начало сбора 5–10 июля, куст – 70 см). ***Ранние, низкие*** – **Подарок брата** (60–70 г) и **Вилина** (80 г) – оба вкусные урожайные, наиболее устойчивые к фитофторозу; **Красная шапочка** (100 г), **Взрыв** (200 г), **Первая любовь** – розовые, до 400 г, с картофельной ботвой, **Винета** – как крупные куриные яйца; **Ляна, Ротон** (80–120 г) оба до 80 см, красивые, плотные, устойчивые к фитофторозу, по ведру плодов с куста. **Мисс Америка –** плоды плотные, отличный вкус, долго хранятся.

***Среднеспелые, низкие*****: Призер, Стрелка** (остроносые) – 40–60 г, закаточные, плотные, вкусные, долго хранятся свежими**; Золотой** и **Дина** (плоды желтые, плотные, имеют красивый товарный вид); **Обильный** (розовые); **Мулат** (80–100 г) – коричневые, по форме – куриные яйца, очень урожайные. ***Крупноплодные***, куст до 1 м: **Тёщина радость** (розовые)**, Золотые купола** (желтые, до 1 кг), **Чёрный русский** (темные, до 600 г); **Десертный розовый** (до 500 г); **Джина** (красные), **Оранжевые** (жёлто-оранжевые, вкусные) – оба до 300 г. **Бычье сердце** – до 600 г. ***Морозо-холодостойкие***, низкие ранние – **Снежная королева** (120 г, хорошо переносит засуху, устойчива к болезням), **Сибиряк** – до 200 г. ***Тепличные,*** они же хороши и для гряд: **Красная стрела –** очень вкусные, 80–120 г; **Славянский шедевр** (красные), **Дворцовые** (розовые) – оба до 500 г, **Сердцеед** и **Грейпфрут** оба до 1 кг, вкусные. ***Высоки*****е** для гряд – ***устойчивые к фитофторозу*** – **Де-Барао: красный, черный, желтый.**

**Перец сладкий:** **Алеся –** красный**,** скороспелый, крупный, урожайный; **Длинный** – красный, по форме плода, – как банан (до 25 см); **Оленька (красные, желтые)** – плоды круглые, мясистые.

**Комнатные овощи** украсят любой подоконник. Помидорки красноплодные и вкусные: **Пиноккио** (20–30 г) среднеспелый, компактный кустик; **Балконное чудо** (30–40 г) – раннеспелый. **Острый перчик** – декоративен круглый год, используется как приправа.

Семена расфасованы: помидоры и перец по 50 шт. и более, огурцы по 30–35 шт., комнатные – 10–12 шт., все остальные – по 10–15 шт. Высылаю наложным платежом 1400 руб. за пакет. От Вас – письмо-заказ. Свой адрес и Ф.И.О. пишите **полностью** и **разборчиво**. Оплата при получении семян на почте. За каждые 10 заказанных пакетов – высылаю **бесплатно** 2 и более пакетов (укажите, что именно) и свою **Агротехнику** выращивания.

**Мой адрес: 213803, Могилёвская обл., г. Бобруйск, 3. До востребования ПРОКОПЧИКУ Виктору Павловичу.**


# СОЛЬ У МЕРУ — ДОБРА

Здароўе на талерцы

**СОЛЬ — папулярная прыправа. Для многіх самая «смачная». Саліць ежу — адна з самых моцных нашых харчовых звычак. Сутачная норма ўжывання солі (хларыд натрыю) — 5—6 г (няпоўная чайная лыжка), але ўжываем мы яе нашмат больш (кансервы, марынады, соусы і г.д.). І становіцца цалкам зразумела, чаму з часам гэтая звычка пераходзіць у разрад «шкодных».**

Напэўна, усе ведаюць, што ўжыванне солі ў вялікай колькасці прыводзіць да гіпертаніі, цяжкіх захворванняў нырак, сардэчна-сасудзістай сістэмы. І ўсё ж без яе не абысціся.

Соль жыццёва неабходная для чалавека. Соль удзельнічае ў падтрыманні і рэгуляванні водна-салявога балансу ў арганізме, натрый-каліевага іоннага абмену. Недахоп натрыю ў арганізме вядзе да абязводжвання арганізма і ўтварэння маршчын. Рознасць канцэнтрацыі солі ўнутры клеткі і звонку з'яўляецца асноўным механізмам для паступлення пажыўных рэчываў да клеткі і вываду прадуктаў яе жыццядзейнасці. Гэты ж механізм падзелу канцэнтрацыі солі выкарыстоўваецца ў генерацыі і перадачы нервовых імпульсаў нейронамі. Акрамя таго, іон хлору ў солі з'яўляецца асноўным матэрыялам для выпрацоўкі салянай кіслаты — важнага кампанента страўнікавага соку.

### ШТО РАБІЦЬ?

У барацьбе за здароўе чалавецтва шукае, чым жа можна замяніць соль. Прапаноўваецца некалькі шляхоў выхаду з сітуацыі.

**1. Выключаць.** Дыетолагі прапануюць гатаваць увогуле без солі. Гэты метад просты толькі на першы погляд, паколькі для любой гаспадыні пасаліць страву — нармальнае, «рытуальнае» дзеянне. Ужо не кажучы пра тое, што трэба яшчэ быць маральна гатовым да таго, каб есці несалёную ежу.

**2. Скарачаць.** У адрозненне ад курэння, якое немагчыма кінуць, адшчыпваючы кожны дзень ад цыгарэты па кавалачку, адвучыць сябе ад солі (прынамсі, скараціць яе ўжыванне) падобным спосабам можна.

Як вядома, выдатнымі смакавымі кампенсатарамі з'яўляюцца спецыі. Таму можна палову сальніцы запоўніць соллю (з нізкім утрыманнем натрыю), а другую палову — сумессю высушаных спецый і траў. Смак у такіх заменнікаў бывае розны — можна яго рэгуляваць любімымі акцэнтамі.

Звычайна добра дапамагаюць вострыя кампаненты: хрэн, перац, грануляваны часнок.

Яшчэ адно ўдалае спалучэнне — здробнены кардамон, каляндра, гваздзіка, насенне сельдэрэю, кінзы або кмену.

Так, запраўляючы сальніцу 50х50, можна скараціць ужыванне солі. Толькі сачыце, калі ласка, за тым, каб не сыпаць у ежу ў 2 разы больш прыгатаванай з прыправамі сумесі.

**Увага!** *Саліць ежу лепш гатовую, прама ў талерцы — гэта зніжае ўжыванне солі.*

**3. Замяняць.** Трэба толькі зразумець, чым менавіта.

● Для паляпшэння смаку можна замест солі апырскаць ежу лімонным сокам, пасыпаць здробненым зяленівам з рэзкім смакам (кінза, арэгана, размарын).

● Можна паспрабаваць вырашыць праблему пры дапамозе заменнікаў солі. Цяпер фармацэўтычныя фірмы ва ўсім свеце выпрацоўваюць заменнікі кухоннай солі. Яны ўтрымліваюць больш каліевых злучэнняў і напалову меншую канцэнтрацыю хларыду натрыю. Па ўласцівасцях і смаку гэтыя заменнікі нагадваюць традыцыйную харчовую соль.

**Увага!** *Памылка лічыць заменнікам солі соевы соус або гатовую гарчыцу. Утрыманне натрыю ў іх дастаткова высокае.*

**Рэцэпт дыетычнага соусу**

*50 г базіліку, 4 ст. лыжкі кедравых арэшкаў, 100 г пармезану, 100 мл аліўкавага алею, 2—3 зубкі часнаку*

Усе інгрэдыенты закладваюцца ў блэндар і перапрацоўваюцца да кансістэнцыі аднароднай масы. Солі не трэба — замест яе смак дае пармезан. Соус можна есці асобна, намазваючы на крэкеры, а можна запраўляць ім мяса або пасту (макарону).

● Ёдаваная соль. Ёд з'яўляецца адным з элементаў, без якога немагчымы нармальны рост і развіццё чалавека. Аднак ёдаваную соль лепш за ўсё ўжываць у салатах, паколькі пры тэрмічнай апрацоўцы ёд выпарваецца і да таго ж надае стравам не вельмі прыемны смак.

● Марская соль. У адрозненне ад каменнай солі, марская соль утрымлівае ў сваім складзе каля 5% іншых мінералаў: магнію, кальцыю, калію і г.д. Таму марская соль больш карысная для здароўя чалавека.

**Увага!** *Ужыванне марской і ёдаванай солі трэба ўважліва кантраляваць тым, у каго ёсць парушэнні функцыі шчытападобнай залозы.*

● Спецыі лічацца самымі ўдалымі заменнікамі солі. Яны надаюць страве асаблівыя смакавыя адценні. Да таго ж спецыі карысныя — яны садзейнічаюць зніжэнню рызыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў і хваробаў нырак; павышаюць імунітэт і жыццёвы тонус.

**Увага!** *Дыетолагі засцерагаюць ад празмернага ўжывання спецый (у неабмежаванай колькасці шкодна ўсё). Тое, што можа дазволіць сабе здаровы чалавек, часта бывае непрымальным для хворага.*

### ЯК ВЫБРАЦЬ?

Перш за ўсё, соль павінна быць сухой. Крышталі солі павінны свабодна перасыпацца. Выбар залежыць ад таго, для чаго вы бераце соль: калі для засолкі — лепш браць буйную соль, для варкі і смажання — дробнакрышталічную кухонную, а для таго, каб падсаліць гатовую страву на стале — ёдаваную.

### ЯК ЗАХОЎВАЦЬ?

Харчовая соль павінна захоўвацца ў сухім месцы, у закрытай шкляной тары, паколькі ўбірае вільгаць. Калі не закрываць соль, яна ўтварае камякі, злежваецца.

Ёдаваная соль патрабуе асаблівых умоў захоўвання: цёмнае халаднаватае месца, каб ёдзісты калій не раскладаўся. Ёдаваная соль захоўвае свае гаючыя ўласцівасці на працягу 4—5 месяцаў (пасля гэтага соль не псуецца, яна проста становіцца звычайнай.) Таму, набываючы яе, абавязкова звярніце ўвагу на дату вырабу.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## Усміхнемся

**З даўніх часоў урачы ўсе лекі выпрабоўвалі на сабе. Менавіта таму настойкі і бальзамы робяцца на спірце.**

☺

Двое сяброў.

— Што ты такі змрочны?

— Грошай няма...

— А ты не спрабаваў хоць па 20 еўра ў месяц у заначку хаваць?

— Спрабаваў. Знаходжу.

☺

**«Во паперла дык паперла!» — падумаў сабака Баскервіляў, заўважыўшы, што ўслед за Герасімам па сцяжынцы панура цягнецца акадэмік Паўлаў.**

☺

— Якія льготы мае ветэран грамадзянскай вайны?

— Якой-якой вайны?!

— Я быў у грамадзянскім шлюбе!

☺

**Я нецікаўная, але калі чалавек увесь час завешвае замочную шчыліну, пагадзіцеся, гэта падазрона.**

☺

Праз тры месяцы пасля падключэння да інтэрнэту са здзіўленнем знайшоў дома жонку, сына і тэлевізар...





**Віншуем з 80-годдзем Алену Сямёнаўну ЮРКЕВІЧ**

з в. Грыцукі Вілейскага раёна.

Дарагая бабуля, жадаем табе моцнага здароўя, даўгалецця, сямейнага дабрабыту. Дзякуй табе, што ты ў нас ёсць!

**Муж, дачка, зяць, унукі, праўнукі.**


Установа адукацыі

**«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ НАСТУПНЫХ ПАСАД:**

- кафедра фізічнага выхавання і спорту: *старшы выкладчык;*
- кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры: *выкладчык;*
- кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый: *дацэнт;*
- кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства: *дацэнт (2);*
- кафедра культуралогіі: старшы выкладчык (2); *дацэнт;*
- кафедра менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці: *выкладчык; старшы выкладчык (2); дацэнт (2);*
- кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці: *прафесар;*
- кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры: *выкладчык, дацэнт (2);*
- кафедра мастацтва эстрады: *выкладчык; старшы выкладчык (2);*
- кафедра беларускай народна-песеннай творчасці: *выкладчык (2); прафесар;*
- кафедра харавога і вакальнага мастацтва: *старшы выкладчык;*
- кафедра народна-інструментальнай творчасці: *старшы выкладчык;*
- кафедра духавой музыкі: *старшы выкладчык (2);*
- кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: *дацэнт;*
- кафедра харэаграфіі: *старшы выкладчык (2);*
- кафедра этналогіі і фальклору: *старшы выкладчык;*
- кафедра рэжысуры абрадаў і святаў: *старшы выкладчык;*
- кафедра замежных моў: *выкладчык;*
- кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументных камунікацый: *старшы выкладчык.*

УНН 100286677.

**Наш адрас: 220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17. Аддзел кадраў.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by


Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 195. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12